ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 МАЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 84 (28194) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Пачалася рэгістрацыя на ЦТ**



**Хто з галавой у рабоце?**



**Як мы на прывідаў палявалі**

# ПАД ПУНСОВЫМІ ВЕТРАЗЯМІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Маладыя мамы Алена КАПУСЦІНА і Наталля АЛЯКСЕЙЧЫК з сынамі Маркам і Дзмітрыем з задавальненнем гуляюць па чыстых прыбраных вуліцах родных Ганцавіч.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Мікалай ШАРСТНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

*«Ці маем мы сёння той узровень школьнай адукацыі, які павінен быць?! Відавочна, што часта без рэпетытараў дзіця не адолее тэсціравання, а значыць, не стане студэнтам. Менавіта таму бацькі ўжо за некалькі гадоў да паступлення пачынаюць шукаць моцных педагогаў, каб падрыхтаваць школьніка да паступлення. Але ж дзяржава ўкладвае ў адукацыю каласальныя сродкі, якія затрачваюцца на тое, каб вывучыць дзяцей, а ў выніку веды адшліфоўваюць рэпетытары. Гэта няправільна, значыць, сістэму адукацыі трэба сур'ёзна ўдасканальваць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19400,00 | ▲ |
| Еўра | 22294,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 293,35 | ▼ |
| Укр. грыўня | 770,45 | ▲ |

16084>
9 771990 763008

## ■ Сацыяльны вектар

# У СТАРАСЦІ МАЕШ, КАЛІ Ў МАЛАДОСЦІ ДБАЕШ

### Забяспечыць больш высокі ўзровень жыцця пры выхадзе на пенсію можа дадатковае пенсійнае страхаванне

**Мы часта ківаем у бок бадзёрых еўрапейскіх старых, якія маюць магчымасць пасля выхаду на пенсію жыць у сваё задавальненне, адпачываючы на круізных лайнерах або папіваючы каву на ўзбярэжжы Атлантычнага акіяна дзе-небудзь у Партугаліі. Чаму яны могуць сабе гэта дазволіць, а нашы пенсіянеры — не? Адказ на гэтае пытанне не настолькі відавочны, як гэта можа падацца на першы погляд. Бо на самай справе і на Захадзе пенсіі, якія выплачвае дзяржава, невысокія і могуць забяспечыць толькі мінімум для выжывання.**

Галоўнае адрозненне паміж тамтэйшымі пенсіянерамі і «нашымі» ў тым, што за мяжой практычна кожны работнік з маладосці пачынае фарміраваць сваю ўласную, назапашвальную частку пенсіі з дапамогай дадатковага пенсійнага страхавання. І гэтыя дадатковыя сумы пасля выхаду на заслужаны адпачынак выплачваюцца яму разам з дзяржаўнай пенсіяй.

Вось і атрымліваецца, што пенсія, якую выплачвае дзяржава, служыць для таго, каб забяспечыць чалавеку самае неабходнае. А дадатковая, самастойна назапашаная, дае магчымасць забяспечыць звыклы ўзровень жыцця, які быў у чалавека, калі ён працаваў.

Для беларусаў гэта пакуль у навіну. У адрозненне ад еўрапейскіх краін мы атрымліваем толькі пенсію ад дзяржавы, а пенсійнае страхаванне ў нас развіта вельмі слаба. Асноўная прычына, як кажуць спецыялісты, — недавер людзей да доўгатэрміновых зберажэнняў. Бо пенсійнае страхаванне — гэта калі дагаворы заключаюцца на 10, 20, а то і на 40 гадоў...

Але страхоўшчыкі адзначаюць, што і нашы суайчыннікі ўжо пачынаюць цікавіцца магчымасцю зарабіць сабе большую пенсію. Так, паводле звестак страхавой кампаніі «Стравіта», за апошнія 5 гадоў колькасць заключаных дагавораў пенсійнага страхавання з фізічнымі асобамі ў іх павялічылася ў 2,6 раза. Пры гэтым сярэдні ўзрост кліента — 39 гадоў, а амаль 40% кліентаў — гэта маладыя людзі да 35 гадоў.

СТАР. 4

## ■ Спажывецкі кошык

# А ШТО Ў ПАКЕЦІКУ?

### З замежным насеннем можна занесці хваробы, якія вас цалкам пазбавяць ураджаю

**Чаму з кожным годам усё складаней атрымаць якасны ўраджай? Адкуль у наш агарод трапляюць усялякія заразы? Якія культуры варта пасадзіць дома? Па адказы на гэтыя і іншыя пытанні звяртаемся ў Інстытут агародніцтва НАН Беларусі.**



**Ультраранні гатунак тамата «Кроха».**

Насенне — той тавар, які не трэба набываць з рук. Адна бяда, калі ў вас вырасце не тая культура, на якую разлічвалі, напрыклад, замест брусельскай капусты — звычайная салатная. Часта на пакетах з насеннем пад рознымі назвамі можа падавацца адзін і той жа гатунак. Але ёсць і больш сур'ёзныя праблемы — з няякасным таварам вы рызыкуеце занесці на свой участак хваробы. Ад некаторых немагчыма пазбавіцца 5 і нават 10 гадоў!

Сёння ў свеце шмат фірмаў, якія займаюцца насеннем. І ніхто з іх адказнасці перад агароднікамі не нясе. Хіба дачнік пойдзе судзіцца з-за аднаго пакеціка насення, тым больш калі ў яго замежныя вытворцы? А вось айчынная прадукцыя правяраецца па ўсходжасці ў дзяржаўнай насеннай інспекцыі, акрамя таго, гатункі выпрабоўваюцца на асобных участках.

— Глебава-кліматычныя ўмовы Беларусі адрозныя ад тых, што ў іншых краінах. Адпаведна, агароднікам трэба выбіраць тыя гатункі, якія прыстасаваны да нашых умоў, — заўважае **загадчык лабараторыі паслёнавых культур, кандыдат біялагічных навук Леанід МІШЫН.** — Яшчэ адзін плюс айчыннага насення — вучоныя адсочваюць найбольш распаўсюджаныя ў краіне хваробы і імкнуцца выводзіць гатункі, якія найбольш да іх устойлівыя. Але існуе шэраг захворванняў, генаў устойлівасці да якіх не знойдзена ва ўсім свеце, напрыклад, фітафтароз тамата.

СТАР. 4

## КАБ ІДЭІ СУПАДАЛІ З МАГЧЫМАСЦЯМІ

### Наша краіна гатова рэалізоўваць з ААЭ сумесныя лагістычныя праекты

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй савета дырэктараў — генеральным дырэктарам карпарацыі «ДзіПі Уорлд» (ААЭ) Султанам Ахмедам бен Сулейман.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў важнасць візіту ў Беларусь аднаго з уплывовых у свеце бізнесменаў. «Думаю, што прыезд у Мінск чалавека, які ведае практычна ўсё аб лагістыцы ў свеце, не выпадковы, — адзначыў Прэзідэнт. — Вы выдатна разумееце, што Беларусь, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, з'яўляецца важным транзітным звяном паміж Усходам і Захадам, Поўначчу і Поўднем. І мне б хацелася, каб за перыяд візіту вы ўбачылі свой інтарэс у Беларусі».

На думку Аляксандра Лукашэнкі, вельмі важна, каб інтарэсы Беларусі і эміратскай карпарацыі супалі. «У нас ёсць шмат ідэй, у вас — немала магчымасцяў, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Таму хацелася б, каб гэта супадзенне прывяло да ўзнікнення новых кампаній, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі, і, адпаведна, новых працоўных месцаў».

Прэзідэнт запэўніў, што гатовы абмяркоўваць з Султанам Ахмедам бен Сулейманам любыя пытанні, і калі эміратская карпарацыя вырашыць інвеставаць у Беларусь, то для яе будуць створаны максімальна добрыя ўмовы, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.

У сваю чаргу Султан Ахмед бен Сулейм выказаў меркаванне, што Беларусь адыгрывае важную ролю ў развіцці транспартнай сістэмы ў Еўропе. Замежны госць адзначыў, што прыехаў у Мінск з мэтай разгляду магчымасцяў наладжвання двухбаковага супрацоўніцтва. На яго думку, Беларусь з'яўляецца вельмі прываблівай краінай з лагістычнага пункту гледжання, у тым ліку і як член ЕАЭС. У ліку аднаго з найважнейшых аспектаў кіраўнік эміратскай карпарацыі назваў стабільную і бяспечную абстаноўку ў Беларусі.

Ён расказаў, што ў яго ўжо адбыліся перамовы з кіраўніцтвам Міністэрства транспарту. «У Беларусі высокі ўзровень развіцця транспартнай і лагістычнай сістэмы, і мы прыйшлі да разумення важнасці вашай краіны ў цэлым у транспартнай сістэме ў Еўропе», — падкрэсліў Султан Ахмед бен Сулейм.

На перамовах гаворка ішла пра тэмы інвестыцый і магчымасці рэалізацыі сумесных доўгатэрміновых праектаў, выгадных для абодвух бакоў.

## СЛЕДЧЫ ПАВІНЕН БЫЦЬ НЕЗАЛЕЖНЫМ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Следчага камітэта Івана Наскевіча. Кіраўнік дзяржавы быў праінфармаваны аб выкананні яго даручэнняў, дадзеных у лютым гэтага года на пасяджэнні калегіі Следчага камітэта. Так, практычна завершана аптымізацыя арганізацыйна-штатнай структуры камітэта. Ёй падвергліся, у прыватнасці, фінансавыя і тылавыя падраздзяленні, і такія крокі Прэзідэнт ацаніў пазітыўна.

Акрамя таго, у Следчым камітэце працягваецца скарачэнне шэрагу пасад. Аляксандр Лукашэнка заклікаў захаваць у шэрагах камітэта лепшых работнікаў. Пад скарачэнне, на думку кіраўніка дзяржавы, могуць трапляць тыя, хто, напрыклад, не жадае працягваць службу.

Прэзідэнту было далажана таксама пра змену крытэрыяў ацэнкі эфектыўнасці следчай работы, пра стан службовай дысцыпліны ў Следчым камітэце, ходзе расследавання рэзанансных крымінальных спраў, якія знаходзяцца на кантролі ў кіраўніка дзяржавы.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка быў праінфармаваны аб развіцці міжведамаснага супрацоўніцтва, у прыватнасці, са Следчым камітэтам Расіі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што Следчы камітэт і яго старшыня падпарадкаваны толькі Прэзідэнту. Па словах кіраўніка дзяржавы, яму час ад часу паступае інфармацыя пра спробы ўплыву на Следчы камітэт у сувязі з прыходам на пасаду кіраўніка новага чалавека. У сувязі з гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што ніякага ўздзеяння на Следчы камітэт быць не можа. Дзейнічаючы ў рамках закона, следчы павінен быць абсалютна незалежным чалавекам, рэзюмаваў Прэзідэнт.

■ Парламенцкі дзённік

## ІНДЫЙСКІЯ ПЛАНЫ

**На наступным тыдні — з 10 па 14 мая — адбудзецца афіцыйны візіт у Індыю парламенцкай дэлегацыі нашай краіны. Кіраўнік дэлегацыі — старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.**

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты, запланаваны сустрэчы з прэзідэнтам Індыі Пранабам Мукерджы, віцэ-прэзідэнтам гэтай дзяржавы — старшынёй Радж'я Сабхі (верхняй палаты. — **Аўт.**) Парламента Індыі М.Х. Ансары, спікерам Лок Сабхі (ніжняй палаты. — **Аўт.**) Парламента С. Махаджан. Прадугледжаны таксама ўдзел старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча ў Беларуска-індыйскім бізнес-форуме, адкрыцці сэрвіснага цэнтра тэхнікі БелАЗ у горадзе Нагпуры, наведванне Нацыянальнага інстытута тэхналогій імя Вісвесвараяйя.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

**Калектыў супрацоўнікаў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні галоўнаму рэдактару «Сельской газеты» Сяргею Рыгоравічу Міховічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю СЯСТРЫ ТАЦЦЯНЫ.**

## БЕСПЕРАПЫННАЕ НАВУЧАННЕ

V Усебеларускі народны сход

### Гэта адзіны спосаб не адстаць ад жыцця

**Дэлегатам IV Усебеларускага народнага сходу быў Пётр ПОЙТА, рэктар Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта. Сёння Пётр Сцяпанавіч дзеліцца з чытачамі некаторымі разважаннямі пра рашэнні галоўнага форуму краіны і іх рэалізацыю на практыцы.**



— На чацвёрты Усебеларускі народны сход, які праходзіў у снежні 2010 года, сабралася 2,5 тысячы чалавек, — расказвае Пётр Пойта, — прадстаўнікі ўсіх колаў беларускага грамадства. У форуме ўдзельнічалі дэпутаты Нацыянальнага сходу краіны, кіраўнікі рэспубліканскіх і мясцовых органаў кіравання, прадстаўнікі ўсіх галін народнай гаспадаркі. Важна, што дэлегатамі сходу сталі амаль тры сотні рабочых, крыху меней працаўнікоў сельскай гаспадаркі, больш за 500 чалавек прадстаўлялі сацыяльна-культурную сферу, былі бізнесмены і вайскоўцы, а таксама студэнты, навучэнцы сярэдніх спецыяльных устаноў, пенсіянеры. Нават такі сціслы пералік катэгорый удзельнікаў паказвае, што беларускі народ быў прадстаўлены максімальна разнастайна. Таму можна гаварыць пра рашэнне сходу як усеагульную праграму дзеянняў на вызначаны прамежак часу.

***— Якія рашэнні пяцігадовай даўнасці сталі для вашай установы праграмнымі?***

— Найперш той раздзел, у якім вызначаны шляхі развіцця адукацыі, гаворыцца аб павышэнні яе якасці, стварэнне гнуткай сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў у адпаведнасці з патрэбамі інавацыйнага развіцця, а таксама наданне ўніверсітэтам функцый цэнтраў навукова-інавацыйнай дзейнасці. На сходзе была пастаўлена задача інтэграцыі нацыянальнай сістэмы адукацыі ў адзіную Еўрапейскую прастору, далучэнне да Балонскага працэсу. Як бачым, апошняе паспяхова дасягнута.

***— Ваш універсітэт з'яўляецца лідарам у падрыхтоўцы будаўнічых кадраў краіны і апошнім часам упэўнена заявіў пра сябе як навукова-практычны цэнтр. Стала прывычным на адкрыцці новых значных аб'ектаў чуць аб удзеле ў іх праектаванні, інжынерным забеспячэнні вучоных і спецыялістаў універсітэта. Арыгінальныя канструкцыі даху знакавых пабудоў, аўтарамі якіх сталі брэсцкія распрацоўшчыкі, атрымалі вядомасць у краіне і за яе межамі.***

— Так, мы ўдзельнічалі ва ўзвядзенні больш чым трох дзясяткаў аб'ектаў у краіне, выконвалі заказы ў некаторых гарадах Расіі і Казахстана. Дзякуючы навуковаму патэнцыялу профільных кафедраў мы гатовы аказаць дапамогу практыкам у любых кірунках: пачынаючы ад падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў, абследавання аб'ектаў як на стадыі будаўніцтва, так і ўжо пабудаваных, усяго спектра пытанняў рэканструкцыі аб'ектаў. У нас ёсць навуковыя сілы, высокакваліфікаваныя спецыялісты, каб выканаць заказы вытворчасці. Да таго ж мы заўсёды гатовы прапанаваць новы варыянт рашэння той ці іншай праблемы. Штогод мы атрымліваем адзнакі прызнання новых будаўнічых ідэй у тым ліку рэспубліканскага ўзроўню.

***— Пра распрацоўкі вашых тытулаваных выкладчыкаў многія ведаюць. Варта назваць амфітэатр «Славянскага базару» ў Віцебску, палацы «Вікторыя» альбо водных відаў спорту ў Брэсце. А ваша моладзь таксама гатовая прапанаваць народнай гаспадарцы новае і перспектыўнае?***

— Некаторыя ідэі і распрацоўкі маладых цалкам вартыя да прымянення на практыцы. І кошт гэтых ідэй узняўся б на некалькі парадкаў, калі б іх удалося ўвасобіць у інжынерных рашэннях. Але для гэтага патрэбны фінансавыя сродкі, якія не заўсёды ўдаецца знайсці. Сярод моладзі, вядома, ёсць перспектыўныя вучоныя-будаўнікі. Маю на ўвазе не толькі нашых, брэсцкіх, але і тых, хто абараняецца ў нашым савеце. Савет па абароне кандыдацкіх дысертацый па будаўнічых спецыяльнасцях працуе ў нас дзесяць гадоў і прад'яўляе даволі высокія патрабаванні да дысертантаў. Дастаткова сказаць, што з паўсотні дысертацый, якія прайшлі праз наш савет за ўвесь час работы, ніводная не была адхілена вышэйшай атэстацыйнай камісіяй краіны.

***— А што змянілася ў выкладанні спецыяльных дысцыплін з улікам сучасных патрабаванняў інавацыйнага развіцця?***

— Маё выступленне на Усебеларускім народным сходзе, дарэчы, таксама было прысвечана інавацыйнаму развіццю. На сучасным этапе ўніверсітэты не маюць права на адставанне ад вытворчасці. Мы з калегамі-аднадумцамі даўно прыйшлі да высновы, што зараз вельмі важна навучыць студэнтаў карыстацца разнастайнымі праграмнымі комплексамі. Цяпер створана дастаткова праграм, якія дазваляюць разлічыць любыя канструкцыі. Таму, напрыклад, на алімпіядах па спецыяльнасці, якія ў нас рэгулярна праходзяць, студэнт атрымлівае заданне на камп'ютары спраектаваць каркас будынка з улікам усіх сучасных патрабаванняў. І бачым, які вучэбны эфект дае такі падыход. Развіваецца творчае мысленне будучага спецыяліста, павышаецца яго здольнасць арыентавацца ў інфармацыйнай прасторы. Сёння жыццё прымушае мяняць сістэму навучання ў бок яе інфарматызацыі і мабільнасці.

Некаторыя дысцыпліны мы па-сутнасці выкладалі 40-50 гадоў аднолькава і баяліся адысці ад прывычнага: здавалася, што са зменай формы выкладання нешта кардынальна парушыцца. Таму, як мы выводзілі, умоўна кажучы, формулу Тэйлара са студэнтамі, так і цяпер вучым іх выводзіць тую формулу, маючы на ўвазе, што ён, студэнт, будзе трымаць складанае рашэнне задачы ў памяці. А можа, цяпер гэта і не патрэбна? Можа, дастаткова паказаць, з дапамогай якой праграмы вырашаецца гэта праблема? Яны на сваіх айфонах паспяхова справяцца з задачай і пойдуць далей у вучэбным працэсе. Магу прывесці яшчэ адзін, больш наглядны прыклад. Прыходзіць студэнт на першы курс, мы выкладаем яму «Будаўнічыя матэрыялы» і, вядома, абапіраемся на тое, што сёння прапануе рынак. Але пройдзе чатыры гады, і матэрыялы істотна памяняюцца. Зменяцца іх асноўныя ўласцівасці, за якія наш умоўны студэнт атрымаў няхай сабе і выдатную адзнаку. Такім чынам мы першапачаткова закладваем адставанне. У гэтай сувязі бачыцца неабходным навучыць студэнта карыстацца інфармацыйным прадуктам, а таксама закласці патрэбу бесперапыннага навучання. Гэта цяпер адзіны спосаб не адстаць ад жыцця. І не толькі ў галіне будаўніцтва.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

■ Падрабязнасці

## ТЭРМІН СЕРТЫФІКАТАЎ ЦТ БУДЗЕ ПРАДОЎЖАНЫ

**Пералік востра запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцяў плануецца фарміраваць кожны год у Беларусі. Пра гэта паведаміў журналістам пасля нарады ў кіраўніка дзяржавы міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ. Такі пералік будзе складацца, пачынаючы з 2017 года, і штогод удакладняцца з улікам вынікаў папярэдняй уступнай кампаніі.**

Як растлумачыў Міхаіл Жураўкоў, размова ідзе пра спецыяльнасці, якія неабходны эканоміцы, але недастаткова папулярныя сярод абітурыентаў. Палегчаны парадак залічэння на іх плануецца ўвесці для пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, маладых людзей, якія скончылі школу з залатым, сярэбраным медалём або якія маюць дыплом аб сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адзнакай, а таксама пераможцаў абласных алімпіяд па вучэбных прадметах. Па словах міністра, цяпер у такі спіс можна было б уключыць спецыяльнасці, звязаныя з лёгкай прамысловасцю, сельскай гаспадаркай, збольшага — з машынабудаваннем і металургіяй. Міністр таксама расказаў пра іншыя навацыі, якія чакаюць абітурыентаў у 2017 годзе.

Так, выпускнікі педагагічных класаў змогуць паступаць на педспецыяльнасці без уступных іспытаў. Адзнакі ў школьным атэстаце ў іх павінны быць не ніжэй за 7 балаў па ўсіх прадметах вучэбнага плана і не ніжэй за 8 балаў — па профільных прадметах. Пры паступленні ў ВНУ такія маладыя людзі будуць праходзіць толькі гутарку. Але тэрмін адпрацоўкі па размеркаванні для іх, як чакаецца, будзе павялічаны да двух гадоў.

Таксама з 2017 года абітурыенты пры паступленні ў ВНУ змогуць здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне па чатырох прадметах. Пры гэтым у прыёмную камісію будуць прадстаўляцца вынікі толькі трох тэстаў. Што тычыцца абітурыентаў ССНУ, то яны атрымаюць магчымасць здаваць тры ЦТ, але прадстаўляць у прыёмныя камісіі будуць вынікі толькі двух тэстаў.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанову аб тым, каб сертыфікат ЦТ дзейнічаў на працягу двух гадоў, а таксама пра павелічэнне колькасці рэзервовых дзён на цэнтралізаваным тэсціраванні да трох. Чакаецца, што ўсе прапанаваныя навацыі ўступяць у сілу з 2017 года. На абітурыентаў 2016 года яны не распаўсюдзяцца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*


ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **ЛОТ №1**. Земельный участок, кадастровый номер 223681109901000043, площадью 0,2320 га, относящийся к категории земель населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов, целевое назначение: для строительства и обслуживания жилого дома. Первоначальная стоимость – **4 200 000** рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | Архипов Антон Васильевич |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская область, Оршанский район, Высоковский с/с, д. Софиевка, ул. Ордишевская, 36 |
| **Информация об обременениях** | Без обременений |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 2 25 мая 2016 года в 14.30 |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши 211391, г. Орша, ул. Островского, 36 Судебный исполнитель – Слепцова Елена Алексеевна, тел. 80216543204 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в повторных торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши № 3642903000794 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 647, УНП 30002505, **не позднее 20.05.2016 г.** Величина шага торгов – не менее 5% начальной стоимости выставленного на торги лота. В соответствии с п. 6 ч. 1 ст. 485 ГПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

Вниманию акционеров

ОАО «Универсам Рига»!

**ОАО «Универсам Рига» по решению Наблюдательного совета ВНОСИТ ИЗМЕНЕНИЯ В ПОВЕСТКУ ДНЯ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, намеченного на 16 мая 2016 года,**
***опубликованную в газете «Звязда» от 27.04.2016 № 78.***

Повестку дня внеочередного собрания акционеров дополнить пунктом 2:

**«2. Принятие решения о сделке, в которой имеется заинтересованность его аффилированных лиц».**

УНП 100299678 *Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига»*

■ Энергетычная бяспека

# КРОПКА АПТЫМАЛЬНАГА «КІПЕННЯ»

**У Жодзіне амаль без дыму працуе самы буйны ў краіне паравы кацёл на мясцовых відах паліва, які дазваляе штогод эканоміць каля 5 млн долараў**

Мінскія энергетыкі адзначаюць, што Жодзінскую ЦЭЦ праектавалі пасля вайны спецыялісты Ленінградскага галіновага інстытута. Першае абсталяванне на нашу цеплавую электрастанцыю прывезлі яшчэ з Германіі. Палівам для тагачаснай станцыі служыў малакаларыйны фрэзерны торф, а ў якасці рэзерву — мазут. У 80-я гады мінулага стагоддзя тут была праведзена рэканструкцыя і катлы былі пераведзены на прыродны газ. Побач узведзены новыя ачышчальныя збудаванні. Паралельна з павялічэннем магутнасці мясцовай цеплаэлектрацэнтралі (ЦЭЦ) рос горад Жодзіна і знакавае прадпрыемства краіны — БелАЗ.

А потым Жодзінская ЦЭЦ трапіла ў комплексную праграму мадэрнізацыі па павелічэнні долі магутнасцяў уласных паліўна-энергетычных рэсурсаў. Праграма прадугледжвала ўстаноўку паравога катла, які будзе працаваць на мясцовых відах паліва, такіх як фрэзерны торф, здроблены торфабрыкет і драўняная дранка. Як выконваецца вызначаная праграма на практыцы, карэспандэнт «Звязды» упэўніўся непасрэдна на выворчай пляцоўцы Жодзінскай ЦЭЦ з дапамогай спецыялістаў Белэнерга.



### Істотная эканомія валюты

Гэта была першая ластаўка падобных энергетычных катлоў на драўняным паліве, але на новым тэхналагічным узроўні. Спраектавалі новае абсталяванне на Белаазёрскім электрамеханічным заводзе ў супрацоўніцтве з адной маскоўскай фірмай.

«Энергетычная вытворчасць гэтага катла складае 60 тон пары ў гадзіну», — расказвае **галоўны інжынер Жодзінскай ЦЭЦ Сяргей ДАЛАНАЎ.** Сёння кацёл аптымальна працуе на сумесі здробненага торфабрыкету з невялікай дабаўкаю фрэзернага торфу і драўнянай дранкі. Што гэта дае? Зразумела, што зімой тут дзейнічаюць і сучасныя турбаагрэгаты на газе, але... Жодзінская цеплаэлектрацэнтраль у летні перыяд прыродны газ увогуле не выкарыстоўвае, а працуе выключна на мясцовых відах паліва. У балансе спажывання прадпрыемствам айчынных «дроў» за год складаюць 25% — 28%.

Спецыялістамі прадпрыемства «Мінскэнерга» было падлічана, што за мінулы год выкарыстанне гэтага універсальнага катла дазволіла замясціць каля 25 тысяч кубічных метраў прыроднага газу на агульную суму 4,7 млн долараў. Менавіта такі аб'ём валюты застаўся ў эканоміцы краіны. Вось яна, эканомія валюты на практыцы.

### ККД — да 92%

Зразумела, што проста спальваць брыкет па схеме хатняй печкі ў прамысловых аб'ёмах ніхто не будзе. Таму і было вырашана выкарыстоўваць тэхналогію «кіпячы пласт», якая дазваляе атрымліваць каэфіцыент карыснага дзеяння (ККД) ад ужывання цвёрдага паліва ў памеры 89—92%.

Як дзейнічае гэты «кіпячы пласт»? Брэцца спецыяльны пясок, які не спякаецца, разаграваецца спальваннем прыроднага газу да 300 градусаў. Потым знізу падаецца вялікі аб'ём паветра, які робіць у пяску псеўдакіпенне. Менавіта ў гэты «кіпячы пласт» падаюць пэўныя порцыямі нашу брыкетна-драўняную сумесь. Праз некаторы час гэты пласт «качагарыць» ужо самастойна і без удзелу прыроднага газу. Менавіта такая сучасная тэхналогія дазваляе спальваць уласнае паліва практычна без адходаў з максімальным ККД.

### Супраць дыму — электрафільтры

Усё гэта цудоўна, але ў складзе брыкету і торфу каля 17—19% складае попел. Але ён сёння нікому не замінае. Атрыманы попел разам з паветрам рухаецца па тракце праз трубу, дзе зроблены спецыяльныя электрафільтры. Гэтыя электронныя прыстасаванні ачышчаюць дым на 95—97%. Таму ў сонечнае надвор'е дым з трубы амаль і не відаць. Далей гэты попел збіраецца ў бункер і машынамі вывозіцца на спецыяльны сучасны і цалкам закрыты палігон.

Існуе меркаванне, што такі попел можна выкарыстоўваць пры стварэнні пэўных будаўнічых матэрыялаў. «Магчыма, гэта і так, але айчынныя «кулібіны» да гэтага кампанента пакуль толькі прыглядаюцца», — кажа Сяргей Даланаў. А на прадпрыемстве такое рэчыва гатовы пастаўляць спажыўцам амаль задарма.

Сёння ў трубе ўстаноўлена спецыяльная сістэма ўліку шкодных выкідаў, што могуць трапіць у атмасферу, якая ў аўтаматычным рэжыме перадае ўсе выяўленыя паказчыкі спецыялістам-эколагам з Мінпрыроды. Каб існавала праблема забруджвання паветра, то заплюшчыць на яе вочы было б проста немагчыма.

### Транспарціровачны пыл

Сказаць, што ў эколагаў цяпер зусім атсутнічаюць пытанні да дзейнасці Жодзінскай ЦЭЦ, пакуль нельга. Часам у ветранае надвор'е ўзнікаюць невялікія праблемы з пылам, але яны выключна лакальныя. Цалкам зняць пытанне вытворчага пылу на тэрыторыі прадпрыемства будзе праблематычна, бо рух вакол складоў з палівам не спыняецца амаль ні на хвіліну. Гэта і не дзіўна, бо кацёл кожны час «з'ядае» 20—25 тон здробненага брыкету.

А паліва сюды прывозяць ажно 15 розных пастаўшчыкоў. На драўняную дранку выкарыстоўваюць неліквідны лес і розныя адходы пры вырабе мэблі, а здроблены брыкет пастаўляе торфабрыкетны завод. Мала таго, што выкарыстанне мясцовага паліва эканоміць дзяржаве мільёны долараў у валюце, але і каштуе яно амаль удвая танней, чым замежны газ.

Галоўны інжынер прадпрыемства згаджаецца з тым, што працаваць з газам энергетыкам прасцей і камфортней. Сучасныя турбаагрэгаты на газе функцыянуюць без збояў і памылак, а абслугоўвае іх у большай ступені аўтаматыка. «Але блакітнае паліва дарагое, больш за тое, залежаць ад аднаго пастаўшчыка энерганосьбітаў краіне не зусім правільна», — упэўнены Сяргей Даланаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*
*Мінск — Жодзіна — Мінск*

■ Будзь у курсе!

## 10 мая ў паліклініках — субота

**На майскія святы графік работы ўстаноў аховы здароўя змяняецца**

**Бальнічныя і амбулаторна-паліклінічныя, санітарна-эпідэміялагічныя ўстановы, аптэкі, арганізацыі пералівання крыві, медыцынскай тэхнікі 9 мая будуць працаваць па графіку святочнага дня, 7 і 10 мая — па графіку суботы і 8 мая — выхаднога дня.**

У выхадныя і святочныя дні работу амбулаторна-паліклінічных устаноў, прыёмных аддзяленняў бальніц, траўматалагічных пунктаў, аддзяленняў інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыі ўзмоцняць найбольш кваліфікаванымі спецыялістамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Пенсіі выплацяць датэрмінова

**Як паведамілі ў прэс-цэнтры «Белпошты», датэрміновая выплата пенсій (дапамог) за 9 мая будзе ажыццяўляцца наступным чынам:**

**з 5 мая** — у аддзяленнях паштовай сувязі Магілёва, Бабруйска, Мінска;
**з 6 мая** — ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай абласцей.

Датэрміновая выплата пенсій (дапамог) за 10 мая будзе ажыццяўляцца:
**з 6 мая** — у аддзяленнях паштовай сувязі Магілёва і Бабруйска;
**з 7 мая** — ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей.

Ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі Гомельскай вобласці выплата пенсій (дапамог) за 9 і 10 мая будзе ажыццяўляцца **7 мая.**

Аб рэжыме працы аддзяленняў паштовай сувязі можна даведацца **па нумары 154.**

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■ Здымнае жыллё

## У сталіцы павялічылі падаткі для кватэраздатчыкаў

**Фіксаваныя стаўкі ў маі ўзраслі прыкладна на 15%**

Рашэнне аб змяненні памераў ставак падаходнага падатку ў фіксаваных сумах пры здачы ўнаём жылых памяшканняў (у разліку за кожны жылы пакой) было прынята Мінскім гарадскім Саветам дэпутатаў, паведаміла карэспандэнту «Звязды» **намеснік начальніка інспекцыі — начальнік упраўлення падаткаабкладання арганізацый горада Вольга КІШКО.**

Цяпер, з першых дзён мая, стаўка падатку ад доўгатэрміновай арэнды ў 1-й эканаміка-планіровачнай зоне Мінска складае 275 тысяч рублёў, у 2-й — 230 тысяч, у 3-4-й — 195 тысяч, а ў 5-й — 160 тысяч рублёў за кожны пакой у месяц.

Усю дадатковую інфармацыю можна даведацца па тэлефоне даведачнай службы падатковых органаў па нумары 229-79-79 альбо ў падатковай інспекцыі па месцы рэгістрацыі арэнднага жылля.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Каб памяталі

# ПРАЗ ПАКАЛЕННІ

**Напярэдадні Дня друку студэнты Інстытута журналістыкі ўшанавалі памяць журналістаў-падпольшчыкаў**

**Помнік журналістам-падпольшчыкам, узведзены на плошчы Незалежнасці ў Мінску, складана не заўважыць нават абыякаваму мінаку. Той, хто ведае яго гісторыю, калі патрапіць у раён Чырвонага касцёла, у выключным выпадку не заверне сюды. Іншыя ж ідуць мэтанакіравана — аб чым сведчаць кветкі і запаленыя свечкі на гранітнай пліце...**

Напярэдадні Дня друку каля помніка сабраліся студэнты Інстытута журналістыкі БДУ. Для іх, першакурснікаў, якія толькі будуць вывучаць гісторыю журналістыкі, першы ўрок пачаўся ўжо зараз, на гэтым святым для журналісцкай супольнасці месцы.

Акурат тут, дзе стаіць помнік, 26 мая 1942 года загінуў галоўны рэдактар першага падпольнага нумара газеты «Звязда», Герой Савецкага Саюза Уладзімір Сцяпанавіч Амельянюк. У той дзень 25-гадовы падпольшчык якраз ішоў у аптэку, каб купіць лекі для партызанаў. Калі выйшаў, адчуў, што за ім сочаць. Пачалася перастрэлка. Журналіст-патрыёт не паспеў схавацца ад варожай кулі.

Ён не нашмат быў старэйшы за іх, сённяшніх першакурснікаў журфака. За плячыма — чатыры курсы Мінскага камуністычнага інстытута журналістыкі. У сваё 24 ён стаў адным з арганізатараў Мінскага падполля, рэдактарам газеты. Вайна застала яго ў Беластоку, дзе Уладзімір Амельянюк праходзіў практыку. У Мінск ішоў пешшу. На гэтым поўным жаху і пакут шляху страціў сваю сястру — яна загінула на яго вачах...



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Каля помніка журналістам-падпольшчыкам. Праспект Незалежнасці.

Побач з помнікам — мемарыяльныя дошкі. Імёны, выгравіраваныя на іх, залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю беларускай журналістыкі. У доме бацькі і сына Воранавых 18 мая 1942 года быў надрукаваны першы нумар падпольнай «Звязды». На кватэры Альбіны Адольфаўны, Пятра Канстанцінавіча, іх сыноў Косці і Паўла стваряўся чацвёрты нумар газеты-«падпольшчыцы». Вячаслаў Нікіфараў, Барыс Пупко, Сяргей Благаразумаў... — амаль усіх тых, хто дапамагаў падпольнаму выданню выходзіць у свет, напаткаў трагічны лёс. Закатаваныя да смерці, многія з іх загінулі ў фашысцкіх засценках. Жыццё іншых абарвала варожая куля...

Ім, будучым журналістам, сёння цяжка ўявіць, што такую высокую цану за існаванне газеты, за мірнае неба над Беларуссю іх папярэднікі заплацілі па сваёй волі. Але яны добра разумеюць, што калі б не подзвіг гэтых людзей, не было б і сённяшняй «Звязды» і яе амаль што стогадовай бесперапыннай гісторыі.

***

У перадапошні раз я падыходзіла да помніка журналістам-падпольшчыкам разам з сынам наборшчыка падпольнай «Звязды» Барысам Александровічам. Будучы ў цэнтры, ён заўсёды заварочваў сюды. Вось і тады — 6 мая 2014 года — усклаў каля помніка кветкі. Казаў, што бацька быў бы яму за гэта ўдзячны: Хасан Александровіч і Уладзімір Амельянюк былі неразлучнымі сябрамі. «Мы ўсе яму абавязаны сваім жыццём. Амельянюк быў сапраўдным патрыётам!» — казаў Барыс Хасанавіч і збіраўся сюды вярнуцца на днях, каб падстрыгчы параслае кустоўе, з-за якога не было відаць прозвішчаў журналістаў-падпольшчыкаў. Не вярнуўся: у гэты ж дзень Барыса Александровіча не стала...

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Не абмініце!

## ЛЕКАВЫЯ СІЛЫ ПРЫРОДЫ

**Пакаштаваць дамашняга мёду і атрымаць у падарунак лекавы збор можна будзе каля стэнда Выдавецкага дома «Звязда» падчас выстаўкі «СМІ ў Беларусі — 2016».**

На форуме беларускіх СМІ, што пройдзе ў сталічным выставачным цэнтры «БелЭкспа» (пр. Пераможцаў, 14) з 11 па 14 мая, самы «зялёны» часопіс Выдавецкага дома — «Родная прырода» дакажа, што расліны могуць не толькі прыносіць эстэтычную асалоду ад іх сузірання, але і аказваць лекавы эфект на арганізм. Так, 12 мая ў 15.00 з наведвальнікамі стэнда сустрэнецца сталы аўтар часопіса, вядомы фітатэрапеўт, аўтар кнігі «Аптэчка прыроды» Яўген Шмярко.

Падарунак чакае і аматараў мёду. 13 мая з 16.00 да 17.00 пройдзе прэзентацыя часопіснай рубрыкі «Клуб пчаляроў». Тут можна будзе пазнаёміцца з вядомым пчаляром Міхаілам Халадзінскім, пакаштаваць дамашняга мёду, а таксама набыць вырабы з пчалінага воску.

Часопіс «Родная прырода» клапоціцца пра тое, каб наша планета як мага даўжэй заставалася чыстай. Таму супрацоўнікі выдання падрыхтавалі адметны майстар-клас, падчас якога навучаць наведвальнікаў стэнда рабіць экалагічныя ўпрыгожванні для дома з другаснай сыравіны. Майстар-клас адбудзецца 14 мая з 12 да 13 гадзін.

«Родная прырода» запрашае на сустрэчу сваіх старых сяброў і новых чытачоў!

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

***Выдавецкі дом «Звязда» ў межах выставы «СМІ ў Беларусі» падрыхтаваў для сваіх чытачоў яшчэ нямала цікавых сустрэч і мерапрыемстваў. Падрабязнасці пра іх — у бліжэйшых нумарах газеты і на нашым сайце zvyazda.by. Чытайце, выбірайце, што вам даспадобы, — і далучайцеся!***

# У СТАРАСЦІ МАЕШ, КАЛІ Ў МАЛАДОСЦІ ДБАЕШ

## У чым сутнасць дагавора пенсійнага страхавання

Страхаванне дадатковай пенсіі прадугледжвае назапашванне сродкаў на рахунку шляхам уплаты на працягу пэўнага перыяду страхавых узносаў страхоўшчыку.

Памер такой пенсіі будзе залежаць ад шэрагу фактараў. У першую чаргу гэта сума страхавых узносаў, перыядычнасць іх уплаты і тэрмін страхавання. Чым большы памер страхавых узносаў, чым часцей іх выплачваюць і чым больш працяглы тэрмін страхавання, тым, адпаведна, большай будзе назапашвальная пенсія.

Усе гэтыя ўмовы агаворваюцца пры заключэнні дагавора. Страхавыя ўзносы можна ўплачваць як штомесяц, так і штоквартальна або раз на год. У дагаворы ўказваецца і перыядычнасць выплаты дадатковай пенсіі (магчымая як аднаразовая выплата ўсіх сродкаў пры наступленні пенсійнага ўзросту, так і штомесячныя, штоквартальныя або штогадовыя выплаты), і іншыя ўмовы выплат.

На страхавыя ўзносы налічваюцца працэнты, і за кошт гэтага выніковая сума выплат павялічваецца. Па сутнасці справы, гэта ў чымсьці падобна на механізм з дэпазітнымі ўкладамі, на якія банк налічвае працэнты. Але ёсць і адрозненні. Адно з іх, напрыклад, у тым, што фізічныя асобы, якія заключылі дагавор страхавання, маюць права на падатковую палёгку. Страхавыя ўзносы ў памеры да 18,13 млн рублёў у год памяншаюць падаткаабкладаемую базу для вылічэння падаходнага падатку. Таксама не абкладаюцца падаходным падаткам страхавыя выплаты і бонус. Акрамя таго, калі ўнёскі за застрахаваную асобу выплачвае наймальнік, то яны таксама не абкладаюцца падаходным падаткам у межах 18,13 млн рублёў.

Пры гэтым страхавыя выплаты пры дасягненні пенсійным страхаванні гарантуюцца дзяржавай. Гэта значыць дзяржава забяспечвае захаванасць грошай, і калі, напрыклад, у страхавой кампаніі ўзнікнуць форс-мажорныя абставіны, усе ўклады страхавальнікаў будуць вернутыя ў поўным аб'ёме. А заключыць дагавор страхавання пенсіі можна не толькі ў беларускіх рублях, але і ў доларах ЗША, еўра або расійскіх рублях. Акрамя гэтага, прадугледжана магчымасць страхавання ў замежнай валюце з выплатай узносаў у беларускіх рублях.

Ну, і ў любым выпадку чалавек пры дасягненні пенсійнага ўзросту атрымае пенсію ад дзяржавы, бо ў нашай краіне захоўваецца дзяржаўная сістэма пенсійнага забеспячэння.

## Страхоўшчыкі даюць адказы

Спрабуючы разабрацца ў тэме, «Звязда» задала некалькі пытанняў **начальніку аддзела маркетынгу РДУСП «Стравіта»** (адной з трох кампаній, якія займаюцца ў нашай краіне дадзеным відам страхавання) **Вользе КАЛЕСНІК.**

***— Што будзе, калі чалавек аформіў дагавор пенсійнага страхавання і пачаў уплачваць узносы, але не дажыў да пенсіі?***

— У гэтым выпадку ўсе назапашанні будуць выплачаныя спадчыннікам (мужу ці жонцы, дзецям, бацькам) у адпаведнасці з законам. Альбо ў дагаворы страхавання можна ўказаць канкрэтнага чалавека, які ў гэтым выпадку зможа атрымаць грошы.

***— Давайце разгледзім сітуацыю, калі чалавек пачаў адлічваць грошы на дадатковую пенсію, але потым, у сувязі з новымі абставінамі, напрыклад стратай працы або хваробай, перастаў. Што будзе з яго ўзносамі?***

— У такой сітуацыі чалавек можа прыпыніць дзеянне дагавора. У гэтым выпадку яго назапашанні не знікаюць, яны будуць ляжаць на рахунку, на іх будуць налічацца працэнты. І пры наступленні пенсійнага ўзросту чалавек атрымае ўсе свае грошы, што ён унёс, плюс працэнты.

**Даведка «Звязды»**

**За мяжой выкарыстоўваюцца розныя мадэлі пенсійных сістэм, якія ўключаюць у сябе разнастайныя інстытуты сацыяльнай абароны — дзяржаўнае сацыяльнае забеспячэнне, абавязковае сацыяльнае страхаванне, асабістае пенсійнае страхаванне і іншыя. У суседняй Літве, напрыклад, пенсіі забяспечваюць дзяржаўная сістэма сацыяльнага страхавання і прыватныя пенсійныя фонды, таму ёсць магчымасць атрымаць пенсіі з абедзвюх крыніц.**

**У адпаведнасці з Указам №137 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якім прадугледжваецца паэтапнае павышэнне пенсійнага ўзросту, кіраўнікам арганізацый рэкамендуецца шырэй прымяняць практыку ўдзелу наймальнікаў і работнікаў у праграмах добраахвотнага страхавання дадатковай пенсіі.**

Да таго ж трэба мець на ўвазе, што жыццёвыя акалічнасці могуць мяняцца не толькі ў горшы, але і ў лепшы бок. Возьмем, напрыклад, сітуацыю, калі 30-гадовы чалавек аформіў дагавор пенсійнага страхавання, на працягу пяці гадоў рабіў узносы, але потым прыпыніў дзеянне дагавора. Праз нейкі час, калі яго абставіны палепшацца, ён можа аднавіць дзеянне дагавора і зноў пачаць уплачваць страхавыя ўзносы. Пазней пры надыходзе страхавога выпадку, г.зн. пры дасягненні пенсійнага ўзросту ён атрымае ўсе назапашванні, якія былі акумуляваныя на яго рахунку.

***— Што будзе, калі кліент вырашыў не прыпыніць дзеянне дагавора, а скасаваць яго?***

— Страхавая кампанія верне яму яго ўзносы, але, з улікам таго, што дагавор скасаваны заўчасна, не ў поўным аб'ёме.

**Святлана БУСЬКО,** *busko@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Тваё правы

# НЕ АПЛАЦІШ ШТРАФ —

### застанешся без пасведчання кіроўцы і аўто

**Фотафіксацыя парушэнняў — справа добрая, але, як высветлілася, клопатная і для саміх парушальнікаў, і для выканаўчых органаў, вымушаных адшукваць даўжнікоў, якія больш за тры месяцы запар не могуць аплаціць штраф. Па колькасці выканаўчых спраў менавіта штрафы займаюць першае месца ў дзейнасці судовых выканаўцаў. Каб палепшыць становішча, Міністэрства юстыцыі Беларусі сумесна з ДАІ прапрацоўвае механізм удасканалення апавяшчэння даўжнікоў.**

— Перад завядзеннем справы інспектары павінны мець доказ, што кіроўца папярэджаны аб сваёй віне. У адносінах да парушальнікаў хуткаснага рэжыму гэта нумар заказнога паштовага адпраўлення, высланага даўжнікам, які дазваляе пацвердзіць факт накіравання пастановы праз інтэрнэт-сэрвіс «Белпошты», — расказаў **Андрэй АЎДЗЕЕЎ, галоўны судовы выканаўца Рэспублікі Беларусь.** — Па іншых правапарушэннях у дакументце павінна стаяць адзнака інспектара, што парушальніку аб'яўлялася папярэджанне і ён пра гэта ведае. Дзякуючы такому падыходу абскарджанняў доўгу грамадзянамі стала значна менш.

Паколькі гадавога ліміту на колькасць штрафаў не існуе, асаблівай увагі на іх (хоць з кожным паўторам некаторых парушэнняў сумы становяцца ўсё большымі) злосныя парушальнікі проста не звяртаюць. Некаторыя маюць да 90 неаплачаных штрафаў за розныя парушэнні. Прычым за асобныя з іх, калі яны паўтараюцца цягам года, прадугледжана нават крымінальная адказнасць. Акрамя таго, на суму штрафаў не налічваецца пеня за пратэрмінўку іх аплаты, як, напрыклад, пры неаплаце «камуналкі».

Пытанне, якое патрабуе карэкціроўкі, тычыцца таксама паўторнага прад'яўлення дакументаў даўжніку. Пакуль сітуацыя такая: нават калі канстатавана, што ў даўжніка няма грошай і маёмасці на аплату ў дадзены момант, гэта не перашкода для паўторнага прад'яўлення дакументаў праз 3-6 месяцаў. Выканаўцы пачынаюць справу нанова, хоць эфектыўнасць такой з'явы не больш за 10%.

— Чалавек «міняе стыль жыцця» вельмі рэдка, — дадаў Андрэй Аўдзееў. — Упэўнены, што эфектыўнасць спагнання даўгоў была б вышэйшай, калі падыходзіць да спагнання штрафаў больш строга. Пакуль не аплаціць — адабраць пасведчанне кіроўцы альбо пазбавіць права здзяйсняць некаторыя адміністрацыйныя працэдуры, у тым ліку тыя, што знаходзяцца ў кампетэнцыі органаў ДАІ. У злосных парушальнікаў арыштоўваць іх транспартныя сродкі і ў выпадку нявыплаты штрафу ў разумны тэрмін — рэалізоўваць аўтамабіль, каб спагнаць запазычанасць. З іншага боку, мы падтрымліваем ініцыятыву МУС адносна лібералізацыі заканадаўства аб адміністрацыйнай адказнасці, у адпаведнасці з якой, за нязначныя парушэнні замест штрафу будзе прадугледжана папярэджанне. Такі падыход стане больш карысным, бо спагнанне невялікіх штрафаў за падобныя правапарушэнні абыходзіцца дзяржаве даражэй, чым сама сума штрафу.

**Ірына СІДАРОК,** *sidarok@zviazda.by*

# А ШТО Ў ПАКЕЦІКУ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Але сёння ў продажы часта можна сустрэць насенне памідораў, дзе напісана, што гатункі ўстойлівыя да гэтай хваробы.***

— Гэта проста прыгожы надпіс. Можна гаварыць толькі аб адноснай устойлівасці. Напрыклад, наш інстытут стараецца выбіраць гатункі больш устойлівыя да фітаспарозу. Агрэсіўнасць гэтай хваробы ў апошнія гады вырасла ў сувязі з тым, што ў краіне сталі больш вырошчваць ранней бульбы. Таматы з гэтай культурай — сваякі, таму яны раней пачынаюць паражацца фітафторай.

Агароднікам можна парэкамендаваць выкарыстоўваць ультраранніх гатункі. За кошт ранняга выспявання яны «ўцякаюць» ад фітафтарозу. Дарэчы, найменш шкодны для чалавека прэпарат, якім можна апрацоўваць памідоры, каб абараніць ад такога захворвання, — бардоская сумесь. З айчынных добра зарэкамендаваў сябе «Азафос палепшаны» (трэба набываць прэпарат, на якім напісана, што ён прызначаны для абароны, бо ёсць і ўгнаенне з такой назвай).

***— Замежнае насенне можа акліматызавацца ў Беларусі?***

— Лічыцца аптымальным, калі насенне вырошчваецца ў той зоне, дзе будзе выкарыстоўвацца. Шэраг еўрапейскіх краін вырабляе яго ў паўднёвых рэгіёнах Іспаніі, у Афрыцы, дзе танная працоўная сіла. Адпаведна, з гэтым насеннем завозяцца тыя хваробы, якіх у нас няма. У прыватнасці, вялікую праблему выклікаў бактэрыяльны рак памідораў. Ён распаўсюджаны ў паўднёвых краінах. У нас яго раней не было. Але агароднікі не паслухалі рэкамендацый вучоных, завезлі гэту інфекцыю. У выніку, каб усё прадэзынфікаваць, мы вымушаны былі поўнасцю адмовіцца ад вырошчвання традыцыйных культур на грунтах, на глебе і перайсці на мінеральную вату. Прыйшлося цалкам мяняць тэхналогію. Адпаведна, давялося вырошчваць іншыя гатункі. Яны ўтрымліваюць ген лёжкасці, які дазваляе прадукцыі захоўвацца месяц і болей, але пры гэтым уплывае на біяхімічную структуру раслін. У іх значна менш накопліваецца цукраў, кіслот і вітамінаў, чым у таматах, да якіх мы прызвычаіліся. Таму яны і падаюцца нам нясмачнымі.



У новых парніках вырошчваюцца гібрыды капусты.

***— А дачнік занёс гэту праблему на свой участак?***

— Натуральна. Людзі тэлефануюць: ураджай цалкам гіне. Там, куды занесена гэта хвароба, дзесяць гадоў ужо нельга вырошчваць ні таматы, ні бульбу, ні перац. Вядома, з пашкоджаных раслін нельга збіраць насенне.

Таматы, якія вырошчваюцца ў плёначных цяпліцах, пашкоджваюцца і кладаспарыёзам. У Беларусі існуюць спецыфічныя расы гэтага захворвання, якіх няма ні ў Расіі, ні ў Польшчы. Нават калі на замежным насенні пазначана, што гатунак устойлівы да кладаспарыёзу, наўрад ці яно падыходзіць нашым агароднікам. Мы бралі для сябе на выпрабаванне 10-15 замежных гатункаў, і толькі 2—3 з іх аказваліся ўстойлівымі да гэтага захворвання ў нашых умовах. Калі вы набудзеце айчынныя гатункі, а яны маюць устойлівасць менавіта да мясцовай расы кладаспарыёзу, хімічную ахову ад гэтага захворвання праводзіць не трэба.

***— Якія яшчэ хваробы мы атрымалі з-за любові да імпартнага насення?***

— Фузарыёз, верцыцыліёз — гэта тычыцца таматаў, расліны вянуць, загніваюць. Па іншых культурах таксама ўсплёск, накапленне інфекцый. Вось чаму неабходна развіваць вытворчасць айчыннага насення. Пасля 90-х гадоў у краіне былі зачынены 13 насенняводчых гаспадарак. Адпаведна, паменшылася на рынку колькасць насення айчыннай селекцыі.

***— Ці можна пазбегнуць хвароб, калі насенне апрацаваць?***

— Калі насенне дэзынфікаваць, можна значна знізіць рызыку занесці хваробу. Тая ж марганцоўка часткова дапаможа. Ёсць розныя пратравы для насення, іх можна выкарыстоўваць па інструкцыі. Але гэта небяспечныя прэпараты, працаваць трэба ў гумавых пальчатках і хоць бы марлевай павязкай закрыць нос ад пылу.

Трэба мяняць севазварот. Акрамя таго, можна выбіраць устойлівыя гатункі. Так, грозным захворваннем з'яўляецца пераноспароз агуркоў. Каб расліны абараніць ад яго, трэба праз кожныя 10 дзён праводзіць моцную хімічную абарону. Вучоныя выявілі гены, якія дазваляюць ствараць гатункі, устойлівыя да гэтага захворвання. Агуркі альбо не хварэюць, альбо ў асобныя гады слаба пашкоджваюцца. Можна назваць такія ўстойлівыя да пераноспарозу гатункі айчыннай селекцыі, як «Зарніца», «Верасень».

Часта з насеннем ці расадай капусты дачнікі заносяць на свой участак кілу, з якой не могуць справіцца 5-10 гадоў. На заражанай тэрыторыі культуры сямейства крыжакветных нельга вырошчваць. Акрамя таго, хвароба лёгка разносіцца, яе можна нават на абутку прынесці на сваю дзялянку ад суседзяў. Заўважу, што нашы вучоныя пачалі ствараць гатункі капусты, устойлівыя да кілы.

***— Адкуль бяруцца праблемы з ухсоджасцю насення?***

— Усходжасць насення вызначаецца ў лабараторных умовах. А калі яго сее дачнік, умовы больш стрэсавыя. Так, таматам, перцу, баклажанам для прарастання патрэбна 25 градусаў. Калі тэмпература вышэй ці ніжэй на 3—4 градусы, мы атрымаем больш нізкую ўсходжасць. Часта для вырошчвання расады агароднікі выкарыстоўваць зямлю з агарода, у якой утрымліваецца шмат інфекцый, у ёй насенне горш узыходзіць, расліны будуць аслабленыя.

***— Дражыраванне насення — абарона для дачніка?***

— Гэта адзін з найцікавейшых кірункаў: у абалонку, якую наносяць на насенне, уводзяць пестыцыды. Насенне афарбаванае, дражыраванае, на момант прарастання абаронена. Вядома, усходжасць яго будзе вышэйшай.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

5 МАЯ 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 8 (15792)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Аляксандр СТАРАСЦІН:

# «Любы варыянт адчування песні правільны»

**Кожны раз, прыязджаючы ў Мінск, музыкі піцерскага гурта Theodor Bastard прызнаюцца, што ў беларускай сталіцы адчуваюць сябе, зусім як дома. Магчыма, справа ў беларускіх каранях лідара калектыву, а можа, — у гасціннай атмасферы, якая нязменна пануе на мінскіх клубных пляцоўках. Ды і самі музыкі падчас выступленняў нібыта запрашаюць слухачоў у свой шацёр, аздоблены яркімі дыванамі, напоўнены рознага кшталту ўнікатамі. Тут усім утульна, можна спакойна памедыцыраваць ці патанцаваць.**

**У ліку «фішак» гурта — завадныя ці, наадварот, медытатыўныя шаманскія рытмы, экзатычныя інструменты з дзіўным гучаннем і песні на старажытных мовах. Музыкі спяваюць пра жыццё і смерць, пра тое, што ты жывеш тут і цяпер, разважаюць пра тое, што застанецца пасля цябе.**

**Пасля нядаўняга канцэрта Theodor Bastard у Мінску наша карэспандэнтка скарысталася магчымасцю пагутарыць з лідарам гурта Аляксандрам Старасціным і распытаць яго пра дзіўныя песні на старажытных мовах, прадзеда, які нарадзіўся ў Мінску, і стаўленне да сучаснай беларускай музыкі.**

***— Аляксандр, гурт Theodor Bastard сёння — зусім не той калектыў, які вы некалі стварылі. Не сумна было развітвацца са звыклым гучаннем, змяняць канцэпцыю каманды?***

— З прыходам у гурт вакалісткі Яны Вевы сапраўды шмат што змянілася. Але ўсё склалася так, што іншага шляху проста не дадзена. Яе голас і наш гук спалучаюцца надзвычай гарманічна. Думаецца, усё, што было да гэтага, — толькі падрыхтоўчы перыяд.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*



Абітурыент–2016

# НА СТАРЦЕ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ

## У КРАІНЕ РАСПАЧАЛАСЯ РЭГІСТРАЦЫЯ НА ЦТ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Амаль месяц будзе ў абітурыентаў на тое, каб канчаткова вызначыцца з пералікам экзаменацыйных дысцыплін і аформіць пропускі на цэнтралізаванае тэсціраванне... Зрабіць гэта можна будзе да 1 чэрвеня ўключна.**

— Паколькі колькасць абітурыентаў у апошнія гады няўхільна змяншалася, мы скарацілі колькасць пунктаў рэгістрацыі на ЦТ з 51 да 41, — паведаміў **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — Скарачэнне закранула пераважна сталіцу. Але мы не скарачалі колькасць месцаў рэгістрацыі і правядзення тэсціравання ў гарадах, дзе такі пункт з'яўляецца адзіным (гэта Ліда, Ваўкавыск, Светлагорск, Пінск, Орша, Барысаў і гэтак далей), каб не ўскладняць жыццё абітурыентам і не прымушаць іх дабірацца да абласных цэнтраў.

Абітурыенты могуць завітаць у любы найбліжэйшы да іх месца жыхарства пункт рэгістрацыі. Усе яны падключаны да аўтаматызаванай сістэмы «Агульнарэспубліканскі банк звестак удзельнікаў ЦТ». Сістэма працуе па прынцыпе «аднаго акна»: сама шукае свабодныя пасадачныя месцы і падказвае рэгістратару, у якіх навучальных установах можна здаць тыя ці іншыя прадметы. Аўтаматызаваная сістэма дазваляе падабраць абітурыенту найбольш зручнае для экзамену месца, нават калі той пажадае здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне ў іншым горадзе.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Свой выбар

# З ГАЛАВОЙ У РАБОЦЕ,

## або Чаму вадалазу неабавязкова добра плаваць

**Пэўна, славуты француз Жак Іў Кусто і яго шматлікія тэлеперадачы ў свой час натхнялі на мары аб працы вадалазам многіх маіх равеснікаў. Але вось неспадзяванка — у Беларусі няма сапраўднага мора. Тым не менш у Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях створаны падраздзяленні, у складзе якіх працуюць і прадстаўнікі гэтай прафесіі. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» правялі адзін дзень разам з 25-гадовым камандзірам аддзялення вадалазна-ратавальнай службы пажарнага аварыйна-ратавальнага атрада Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Паўлам СТУЖЫНСКІМ.**

### ДОННЫ СПЕКТР ПРАЦЫ

...Раніцай мы прыязджаем у Заслаўе — на галоўны канал Вілейска-Мінскай воднай сістэмы. Ужо некалькі дзён тут працуюць ратаўнікі: вышэй па цячэнні ў ваду трапілі нафтапрадукты. Задача МНС — ліквідаваць наступствы аварыі і не дапусціць пападання небяспечнага рэчыва ў вадасховішча.

У пойму канала павольна заязджае чырвоная «Газэль» з лафетам, да якога прымацавана лодка з маторам. У машыне — вадалазы, што базуюцца ў Маладзечне. Менавіта яны занятыя ў ліквідацыі наступстваў аварыі.

— Першая задача нашай службы — аказанне дапамогі тым, хто церпіць бедства на вадзе і пад вадой, і ліквідацыя надзвычайных сітуацый прыроднага і тэхнагеннага характару, — гаворыць быццам бы вывучанае на памяць Павел. — Але насамрэч займаемся вельмі шырокім спектрам працы. Скажам, дапамагаем вырашаць тэхнічныя работы на вытворчасці, напрыклад чысцім падводнае абсталяванне на ТЭЦ і вадасховішчах. Падымаем са дна самую розную тэхніку. Часам шукаем зброю, дапамагаючы міліцыі. Хоць людзі звычайна думаюць, што вадалазы толькі тапельцаў шукаюць. Гэта не зусім правільна — такая праца ў першую чаргу з'яўляецца прэрагатывай Таварыства выратавання на водах.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

Нават у ледзяной вадзе трэба захоўваць спакой і абсалютную канцэнтрацыю.

Асабісты прыклад

# Віктар ЖУК: «Гісторыя — не проста скарбніца фактаў»



**Выкладчык гісторыі і грамадазнаўства з Маладзечна Віктар Жук у 2014 годзе перамог у рэспубліканскім конкурсе «Настаўнік года Беларусі». Галоўную ўзнагароду — «Хрустальнага жураўля» — яму прынеслі любоў да гісторыі, энтузіязм і творчы падыход да выкладання. Конкурсны запал сціх, жыццё вярнулася ў звычайнае рэчышча. «Чырвонка» наведала маладога настаўніка, каб высветліць, як праходзяць яго працоўныя будні.**

— Адразу пасля конкурсу не было вольнай хвілінкі. Адлучаўся кожны тыдзень — семінары, майстар-класы, выступленні, адкрытыя заняткі. Дзеці добра памятаюць тыя дні, жартуюць у КВЗ — «Зноў мы прагульваем гісторыю, Віктар Эдуардавіч 30-ты раз паехаў на рэспубліканскі семінар». Цяпер «вандровак» нашмат менш, амаль увесь час я ў школе. У гэтым годзе, акрамя старшых класаў, вяду заняткі і ў пятых.

***— З кім лягчэй працаваць?***

— З кожным класам па-свойму цікава. Пяцікласнікі шумныя, ім яшчэ цяжка прывыкнуць да дысцыпліны. Важна іх не спужаць, не перавтарыць у маўклівых «скульптуры», накіраваць іх энергію ў правільнае рэчышча. З 10, 11 класамі можна дыскутаваць на сур'ёзныя тэмы, рашаць складаныя задачы. Спачатку было цяжка пераключацца: напрыклад, са старшакласнікамі абмяркоўваем Версальска-Вашынгтонскую сістэму, а ўжо праз пару хвілін разбіраем у пятых класах грэчаскую міфалогію. Цяпер звыкся.

***— Ці павінен педагог быць на «ты» не толькі са сваім прадметам, але і з сучаснымі тэхналогіямі?***

— Шмат гаворкі пра тое, што навучэнцы з раніцы да вечара сядзяць у інтэрнэце, дык чаму не скарыстацца гэтым у сваіх мэтах? Настаўнік павінен ісці ў нагу з часам! Я арганізаваў у сацыяльнай сетцы магчымасць дыялогу са старшакласнікамі, размяшчаю там розную кшталту інфармацыю. Стасункі ў сацсетках хуткія і зручныя. Школьнікі пішуць часта, нешта недаслухаюць на занятках, пытаюцца, удакладняюць. Часта дзеці думаюць, што ў інтэрнэце паное ўсёдазволенасць, і забываюцца пра культуру паводзін. Але мае вучні ведаюць, што звяртаючыся да мяне, трэба выконваць граматычныя і этычныя правілы. Калі я атрымліваю паведамленне з памылкамі, прашу выправіць і напісаць правільна.

***— Тэхнічныя ноу-хау не заглушылі любоў да чытання?***

— На маю думку, чытаюць сёння менш. Але зусім ад кніг не адмаўляюцца. Адным разам правяраў практыкум па грамадазнаўстве ў вучаніцы 11 класа і ўбачыў цікавыя разважанні, у якіх былі адсылкі да вядомых аўтараў. Праца мне спадабалася. Высветлілася, што школьніца не проста так змясціла там цытаты, у яе дома збор кніг, які ўвесь час папаўняецца. На наступны дзень яна прынесла мне пачытаць Сартра і Коба Абэ. Мы з вучнямі часта абменьваемся кнігамі, абмяркоўваем іх, дзелімся ўражаннямі. Не так даўно браў у школу раман-эпапею «Уладар пярсцёнкаў», ахвотнікаў пачытаць было шмат.

***— Вы захапляецеся ваенна-гістарычнай рэканструкцыяй, ездзіце на раскопкі і ходзіце ў паходы. Вучняў да сваіх хобі далучаеце?***

— Рэканструкцыя — маё асабістае захапленне. Займаюся ёй больш за дзесяць гадоў. Гэта не проста яркія і прыгожыя касцюмы, а яшчэ і вялікая праца з крыніцамі. Я ўзнаўляю вобраз нямецкага пехацінца сярэдзіны XIV стагоддзя. Мой касцюм доўга эвалюцыянаваў, і цяпер мне не сорамна паказацца на фестывалях рознага маштабу. Апошнія гады аддаю перавагу ціхім і спакойным праектам фармату «жывая гісторыя», дзе збіраецца вузкае кола аднадумцаў і турысты не ходзяць натоўпам. А з навучэнцамі мы падарожнічаем па вёсках і пасёлках Маладзечанскага раёна. У чэрвені, пасля экзаменаў, ідзём у турыстычны паход на дзён дзесяць. Апошнія гады ў нас быў ажыятаж. Паход стаў для многіх стымулам вучыцца лепш, бо ўсіх ахвотных узяць мы проста не змаглі. У паходзе сціраюцца сацыяльныя ролі



Віктар Жук на ўроку.

настаўнік—вучань. Усе становяцца турыстамі — мы сядзім вакол вогнішча, спяваем песні пад гітару. Гэта выдатная магчымасць пазнаёміцца з вучнямі бліжэй. Выхады на прыроду для мяне — свята. Сёлета мы таксама збіраемся ў паход.

***— Выходзячы за парог школы, што павінны засвоіць вучні з вашага прадмета?***

— Факты, паняцці, персаналіі — гэта ўсё хутка вылятае з галавы школьнікаў. Таму на ўроках я вучу іх крытычна ацэньваць інфармацыю, адстойваць уласны пункт гледжання, разважаць, не баяцца выступаць перад публікай. Мае заняткі будуюцца на дыялогу. Вучні выказваюць свой пункт гледжання, адказваюць на пытанні, задаюць іх. Гісторыя — не проста скарбніца фактаў. У першую чаргу гэта плацдарм для фарміравання пэўных якасцяў, кампетэнцый, якія спатрэбяцца вучням у дарослым жыцці. Засвоіўшы гэтыя навыкі, ім будзе лягчэй знаходзіць галоўнае, адсяваючы інфармацыйнае «смецце».

***— Як сёння можна павысіць прэстыж прафесіі настаўніка?***

— Значнасць прафесіі залежыць не толькі ад дзеянняў дзяржавы і Міністэрства адукацыі. Яна залежыць і ад самога настаўніка. Калі ўвесь час казаць, як дрэнна нам жывецца, то ўсе будуць ставіцца да настаўнікаў адпаведным чынам. Лічу, што калі чалавек любіць сваю прафесію, калі ён адданы сваёй справе, то яго нічога не спыніць.

**Хрысціна ХІЛЬКО.**

# НА СТАРЦЕ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Зарэгістравацца для ўдзелу ў ЦТ можна не больш чым па трох вучэбных прадметах: па беларускай ці рускай мове (на выбар) і па двух прадметах у адпаведнасці з профілем (напрамкам) спецыяльнасці.

## Аплата — праз інтэрнэт і інфакіёскі

У пункт рэгістрацыі на ЦТ абітурыент павінен прыйсці з пашпартам (непратэрмінаваным!) або іншым дакументам, што пацвярджае яго асобу (гэта можа быць пасведчанне на права жыхарства, пасведчанне бежанца ці афіцыйная даведка, якая выдаецца органамі ўнутраных спраў у выпадку страты ці крадзяжу дакумента, што пацвярджае асобу). Ніякія іншыя дакументы, у тым ліку **вадзіцельскае пасведчанне, для рэгістрацыі не падыходзяць.**

Выбар мовы, на якой абітурыент жадае здаваць тэсты, ажыццяўляецца менавіта на этапе падачы заявы і рэгістрацыі на ЦТ. Заява запаўняецца ўдзельнікам ЦТ на адной з двух дзяржаўных моў: беларускай ці рускай на выбар. Трэба мець на ўвазе, што **пазней на цэнтралізаваным тэсціраванні зона рэгістрацыі бланка адказаў будзе запаўняцца абітурыентам на той жа мове, на якой была пададзена заява пры рэгістрацыі.** І сертыфікат удзельніка ЦТ будзе запаўняцца таксама на той мове, на якой падавалася заява.

Пасля падачы заявы абітурыент атрымлівае ў работніка пункта рэгістрацыі асабовы рахунак і ажыццяўляе аплату за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ. Гэта сума складае 0,1 базавай велічыні (21 тысячу рублёў) за адзін вучэбны прадмет.

**Галоўнае нава ўвядзенне гэтага года** — выкарыстанне пры разліках сістэмы АРІП (адзінай разліковай і інфармацыйнай прасторы). Абітурыентам не трэба будзе падаваць у пункт рэгістрацыі дакумент, які пацвярджае факт аплаты, бо ўся інфармацыя аб праведзеных плацяжах акумулюецца ў сістэме АРІП, і ў электронным выглядзе яна будзе даступная і ўстановам адукацыі, і Рэспубліканскаму інстытуту кантролю ведаў.

Ажыццявіць аплату можна любым з даступных спосабаў: у інфакіёсках, плацежных тэрміналах і банкаматах, тэрміналах Cash-In, разлікова-касавых цэнтрах банкаў, з выкарыстаннем інтэрнэт-банкінгу і мабільнага банкінгу (зрабіць гэта можна будзе непасрэдна ў пункце рэгістрацыі на ЦТ), а таксама наяўнымі грашовымі сродкамі ў касах любога банка. Але ў выпадку аплаты наяўнымі грашыма банкі могуць браць камісійную ўзнагароду, таму лепш загадзя пацікавіцца ў касіра яе памерам.

— Каб завяршыць працэс рэгістрацыі для ўдзелу у ЦТ, абавязкова трэба **забраць у пункце рэгістрацыі пропуск** на цэнтралізаванае тэсціраванне, прад'явіўшы дакумент, які сведчыць асобу абітурыента. Без выкання гэтай умовы вы не зможаце прыняць удзел у ЦТ! — папярэдзіў Мікалай Фяськоў.

## У парадку выключэння

Летась была ўведзена норма, якая дазваляе падаваць дакументы на рэгістрацыю, а таксама атрымліваць сертыфікат ЦТ прадстаўнікам абітурыента (у выпадку адсутнасці ў самога абітурыента такой магчымасці па ўважлівай прычыне), паколькі ў жыцці ўзнікаюць самыя розныя і непрадказальныя сітуацыі: спартсмены едуць на спаборніцтвы ці зборы, музыканты — на фестывалі, патэнцыяльны абітурыент можа аказацца ў службовай камандзіроўцы і гэтак далей. **Законны прадстаўнік абітурыента** абавязаны прад'явіць у пункце рэгістрацыі дакумент, які пацвярджае яго асобу і статус законнага прадстаўніка, а таксама копію дакумента, што пацвярджае асобу абітурыента, завераную натарыяльна. Акрамя таго, законны прадстаўнік абітурыента можа дзейнічаць на падставе даверанасці, заверанай натарыяльна.

Замежныя грамадзяне і грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі замежных дзяржаў, могуць накіраваць у пункт рэгістрацыі копію дакумента, які сведчыць іх асобу, і заяву па пошце, а рэгістрацыйны ўзнос аплаціць пасля прыезду ў Беларусь, але не пазней, чым за адзін дзень да пачатку тэсціравання па вучэбным прадмеце. Заяву можна спампаваць на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў (www.rikz.unibel.by). Арыгінал дакумента, які сведчыць асобу, у гэтым выпадку прад'яўляецца пры атрыманні пропуска для праходжання тэсціравання.

## Апошняя рэпетыцыя

У 2015 годзе сваё жаданне ўдзельнічаць у прыёмнай кампаніі афіцыйна аформілі 101,7 тысячы чалавек. У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў мяркуюць, што і сёлета колькасць ахвотных паўдзельнічаць у экзаменацыйнай кампаніі будзе не меншай. Ва ўсялякім выпадку, актыўнасць патэнцыяльных абітурыентаў на рэпетыцыйным тэсціраванні была дастаткова высокай.

Між іншым, ва ўсіх ВНУ трэці этап рэпетыцыйнага тэсціравання ўжо завяршыўся, але на базе Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў да канца мая яшчэ можна будзе скарыстацца рэпетыцыйнай спробай.

— Прычым у нас можна прайсці як рэпетыцыйнае тэсціраванне на бланку, так і камп'ютарнае, — удакладніў Мікалай Фяськоў. — А можна скарыстацца і першым, і другім варыянтам. У будні тэсціраванне распачынаецца ў 14 гадзін, а па суботах прадугледжаны дзве сесіі: у 9.00 і 13.00.

**Мікалай Фяськоў нагадаў, што пункты рэгістрацыі на ЦТ будуць працаваць у працоўныя дні тыдня з 9.00 да 19.00, а таксама па суботах (14 і 28 мая) і ў нядзелю (22 мая) з 9.00 да 18.00.**




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Падчас камп'ютарнага тэсціравання** прапануюцца заданні з той жа базы, што і на звычайным. Розніца ў тым, што абітурыент працуе перад камп'ютарным маніторам і напрыканцы выпрабавання можа адразу даведацца свой вынік. У абітурыента ёсць магчымасць тут жа папрацаваць над сваімі памылкамі. Спачатку да няправільна выкананых заданняў яму даецца падказка, а калі і яна не дапамагае, можна проста «падглядзець» правільнае рашэнне.

Кошт удзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні (і камп'ютарным, і на папяровых носьбітах) складае 61 тысячу рублёў за кожны прадмет. Зарэгістравацца можна на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў.

Таксама на сайце інстытута можна знайсці і дэманстрацыйныя варыянты тэстаў па ўсіх дысцыплінах, акрамя кітайскай мовы, якія даюць магчымасць любому ўдзельніку ЦТ і шырокай грамадскасці скласці ўласнае ўяўленне аб структуры варыянтаў тэстаў, тыпах заданняў і ўзроўні іх складанасці.

— Пасля 1 чэрвеня ніякія тлумачэнні кшталту «я хварэў» ці «мяне не было ў краіне» мы прымаць не будзем. Месяц — дастатковы тэрмін для таго, каб прайсці працэдуру рэгістрацыі, — падкрэсліў ён.

Летась у апошні дзень (1 чэрвеня) у пункты рэгістрацыі прыйшлі 4,5 тысячы чалавек. Але ўжо раніцай 2 чэрвеня тэлефон у Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў распаліўся ад званкоў абітурыентаў, якія прасілі іх зарэгістраваць... у парадку выключэння.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by

### Інструкцыя для здзяйснення плацяжу ў сістэме АРІП:

1) ВЫБРАЦЬ:
— пункт «Сістэма «Разлік» (АРІП);
— агульнарэспубліканскія;
— адукацыя і развіццё;
— РІКВ;
— цэнтралізаванае тэсціраванне.

2) увесці асабовы рахунак, атрыманы ў пункце рэгістрацыі;

3) пераканацца ў тым, што прозвішча, імя і імя па бацьку абітурыента, якія адлюстроўваюцца на экране тэрмінала аплаты, камп'ютара ці мабільнага тэлефона (у залежнасці ад таго, якім чынам вы здзяйсняеце плацеж) адпавядаюць вашаму прозвішчу, імені і імені па бацьку. У выпадку неадпаведнасці (гэта магчыма, калі вы памыліліся пры ўводзе асабовага рахунку) адмяніце бягучае дзеянне і пачніце працэс аплаты спачатку;

4) здзейсніць плацеж.

Калі вы ажыццяўляеце плацеж у касе банка, паведаміце касіру пра неабходнасць правядзення плацяжу праз сістэму «Разлік» (АРІП).




З Наталляй Лубнеўскай

# ЗДАРОЎЕ З АГАРОДА

**Знаёмыя дзяўчаты, якія вырашаюць пераключыцца на правільнае харчаванне, прызнаюцца, што прызвычаіцца да новай ежы — не самае складанае. Куды большае выпрабаванне — прывучыць сябе планаваць свой рацыён наперад і гатаваць па вечарах ссабойкі на ўвесь дзень. Ды і ўзважваць кожную порцыю, каб выпадкова не перабраць ліміт дазволеных калорый, таксама стамляешся.**

Як той казаў, за вашы грошы — любы капрыз. У сеціве наткнулася на аб'яву сталічнай кампаніі, якая гатова ўсё зрабіць за вас: падлічыць, прыгатаваць і падаць гарачым да стала. Вам застаецца толькі есці і худзець. Рацыёны прапануюць у залежнасці ад ладу жыцця: тым, хто мала рухаецца і ўвесь дзень праводзіць у крэсле, зразумела, калорый патрабуецца менш, чым аматарам фізічных нагрузак.

Ідэя цікавая. Дарагая, праўда: за адзін дзень правільнага харчавання па сістэме all inclusive давядзецца аддаць прыкладна паўмільёна рублёў! Нават за разгрузачны дзень, які звычайна прынята праводзіць на яблыках з кефірам. Рацыён у прынцыпе разнастайны. Там і гародніна, і сыры розных гатункаў, і мяса далікатэснае. Але ж на тры мільёны на тыдзень і не такога накупляць можна. Пахудзець па прапанавай сістэме рэальна. Пры ўмове, што нічога, акрамя прывезеных кур'ерам порцый, вы есці не будзеце. А гэта, самі разумееце, вой як цяжка бывае (сіла волі ў набор сняданкаў і абедаў не ўваходзіць). Калі думаеце, што ад некалькіх цукерак нічога не будзе, вось вам статыстыка: на незапланаваных перакусах мы наядаем да 650 калорый. Гэта чвэрць, а то і больш, ад сутачнай патрэбы.

Цяпер модна худзець на экзатычных прадуктах. Пачытаць глянцавыя часопісы, дык найлепшыя сябры вашай фігуры — грэцкая локшына і вада з хларафілам. Для тых, хто толькі ўчора ўпісваў булкі з маслам, гэта, здаецца, занадта. Звычайная грэчка дала б не горшыя вынікі. Прадаўцы ж карыстаюцца нашым невуцтвам: у апісанне прадуктаў дадаюць радок «спрыяе пахудзенню». Нават калі тая заморская садавіна ці насенне такі эфект не гарантуе. Напэўна, чулі пра разрэкламаваныя ягады годжы? Прадукт сапраўды карысны. Тым, хто хоча ўмацаваць імунітэт, — калі ласка. А вось скінуць лішняе... «Ёсць толькі адзін спосаб пахудзець на ягадах годжы, — пачула неяк жарт у аптэцы. — Ужываць іх па сталовай лыжцы на сняданак, абед і вячэру. Замест ежы».

Рэкламе ўвогуле не варта давяраць. І людзям, якія ў кадры расказваюць, што выпрабавалі нешта на сабе, таксама. Мне нядаўна адна кампанія, якая выпускае ёгурт, прапанавала паўдзельнічаць у рэкламным праекце. Сутнасць простая: трэба было прытрымлівацца пэўных рэкамендацый па фізічных нагрузках і харчаванні, есці кісламалочныя прадукты і дзяліцца сваімі поспехамі ў анлайн-дзённіку. А праз месяц расказаць, як палепшылася самаадчуванне. «Можаш і не прытрымлівацца праграмы, галоўнае — рабі выгляд», — напісалі мне. Я адмовілася. Муж, калі даведаўся, колькі за гэта прапаноўвалі плаціць, сказаў, што дарма. «Яшчэ б і ёгурт бясплатна выдавалі», — уздыхнуў ён. Парады, дарэчы, ад той кампаніі добрыя былі. Напрыклад, чысціць зубы, прысядаючы, і займацца спортам, калі злуешся. Але ўжыванне ёгурту на іх эфектыўнасць ніяк не ўплывае.

Хочаце карысных прадуктаў? Зазірніце на сезонны рынак. Бабулі-гандляркі дрэннага не параяць. І грошай з вас шмат не возьмуць. Мне асабіста ўвесну заўсёды хочацца салаты з радыскай і зялёнай цыбуляй (памятаеце, я расказвала пра інтуітыўнае харчаванне?). Успомніла вясковы агарод і падумала, што, бадай, найлепшыя парады па здаровым ладзе жыцця я атрымала ад бабулі з дзядулем. Яны прывучалі есці тварог, жаваць яблычныя «чыпсы» замест звычайных і перакусваць парэчкамі з агрэстам. А дзядуля адпраўляў раніцай на прабежку да лесу. Казаў, для апетыту.

А наконт няпростасці правільнага харчавання... Паспрабуйце спачатку хаця б не прапускаць сняданак. З кантэйнерамі на ўвесь дзень потым разберацеся.

*Працоўны семестр*

# ЗНАЙСЦІ СЯБРОЎ... НА РАСКОПКАХ

**Пераважная большасць студэнтаў і навучэнцаў яшчэ толькі рыхтуюцца да здачы экзаменаў, але для некаторых з іх ужо пачынаецца новы семестр — працоўны. Урачыстая цырымонія яго афіцыйнага адкрыцця адбылася ўчора на плошчы Дзяржаўнага сцяга. Удзел у ёй узялі каля 800 байцоў, камандзіраў і камісараў штабоў зводных абласных і Мінскага гарадскога студэнцкіх атрадаў. Цэнтральным момантам цырымоніі стала ўручэнне студатрадам пуцёвак для працы на сацыяльна значных аб'ектах.**




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

«Байцы»-медыкі прыйшлі на мерапрыемства з партрэтамі Герояў Савецкага Саюза, лёс якіх звязаны з Беларуссю.

— Сёлета мы традыцыйна плануем адправіць нашых «байцоў» і ў Расійскую Федэрацыю, — расказаў журналістам **другі сакратар ЦК Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Сяргей КЛІШЭВІЧ**. — Гэта, у першую чаргу, будуць педагогі і будаўнікі. Адпаведна, у Беларусь прыедуць расійскія студэнты, каб працаваць на нашых аб'ектах, у тым ліку і на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ў Астраўцы.

Галоўнай адметнасцю гэтага года стане з'яўленне археалагічнага атрада — ён будзе працаваць на раскопках старажытнага беларускага паселішча ў вёсцы Горваль Рэчыцкага раёна. Акрамя гэтага, саюз моладзі плануе сумесна з МНС і Мінсельгасхарчам стварыць студатрад, які будзе займацца ахоўай гаспадарак ад пажараў.




Андрэй Беляков перадае працоўную пуцёўку камісару Гомельскага абласнога штаба студэнцкіх атрадаў Дзмітрыю Сіваму.

— Для нас стала добрай традыцыяй урачыста адкрываць летні працоўны семестр, — сказаў падчас цырымоніі **першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ**. — Глыбока сімвалічна, што сённяшняе мерапрыемства адбываецца напярэдадні свята для кожнага беларуса Дня Перамогі. Летась менавіта БРСМ праявіў ініцыятыву і даў старт праекту «Кветкі Вялікай Перамогі», які сёлета стаў агульнанацыянальным. Вельмі прыемна, што беларускія студатрадаўцы робяць свой унёсак у будаўніцтва нашай краіны.

Для пераважнай большасці студатрадаўцаў гэты працоўны семестр будзе ўжо не першым. «Летась я працаваў у студэнцкім атрадзе «Ліцэіст», — дзеліцца **Павел РАМАНОВІЧ, навучэнец Валожынскага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя**. — Мы займаліся ўборкай збожжа ў адной з гаспадарак раёна. Дарэчы, нядрэнна зарабілі — без малага пяць мільёнаў. Але галоўнае — весела правялі час з новымі сябрамі. Абяцаюць, што сёлета з'явяцца новыя віды атрадаў, таму абавязкова знайду для сябе што-небудзь цікавае».

Вядома, ёсць і тыя, хто сёлета дэбютуе як «баец». Сярод іх, напрыклад, **навучэнка Гомельскага педагагічнага каледжа імя Л.С. Выгоцкага Юлія БУДЗЬКО**. «Далучыцца да студатрадаўскага руху мяне падштурхнула цяга да новых знаёмстваў — я вельмі камунікабельны чалавек, а ў атрадзе можна знайсці новых сяброў, — кажа дзяўчына. — Акрамя таго, я шчыра люблю сваю прафесію, таму працаваць у педатрадзе будзе для мяне за шчасце».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Інавацыі ў адукацыі*

# АЖЫВІЦЬ МАШЫНУ,

## ці Чым карысныя «гульні ў робатаў»

**Сталічнаму стартапу «Школа робататэхнікі» нядаўна споўнілася тры гады. Дзень нараджэння адзначылі незвычайна — далі магчымасць ахвотным журналістам, сярод якіх быў і карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай змены», самім сабраць машыну.**



Прыклады таго, якіх робатаў ствараюць прасунутыя наведвальнікі школы.

У якасці лабараторыі выкарыстоўваем памяшканне адной са сталічных гімназій — тут ужо доўгі час размяшчаецца адна са «Школ робататэхнікі». Дарэчы, усяго ў Мінску і ваколіцах такіх кабінетаў больш за 40, а вучыцца ў іх больш за тысячу юных аматараў робатабудаўніцтва.

Задача — сабраць невялікі механізм, дзве часткі якога (у выглядзе птушак) павінны круціцца ў розныя бакі. Хуценька разбіраюся з каркасам і дабаўляю да яго рухомыя элементы: гумку (яна выконвае ролю раменнай перадачы), прывад і маторчык з платай, якая падключаецца да камп'ютара.

— Галоўнай мэтай праекта мы лічым з'яўленне падобных да гэтага кабінетаў у кожнай школе Беларусі, — кажа тым часам **стваральнік «Школы робататэхнікі» Ігар БЯЛЕВІЧ**. — Ужо цяпер працуем над тым, каб распачаць работу ў абласных цэнтрах, а не толькі ў сталіцы. Галоўная перавага навучання робататэхніцы ў тым, што, ствараючы машыны, навучэнец адразу наглядна бачыць, навошта яму патрэбны многія школьныя прадметы. Бо без матэматыкі і фізікі ты не зможаш дакладна разлічыць тэхнічныя характарыстыкі мадэлі, а без англійскай мовы яе не запраграмуеш. Гэта так званая сістэма STEM-адукацыі (science — навука, technology — тэхналогія; engineering — інжынерыя; math — матэматыка).



Фота Надзеі БУЖАН.

У захапленні былі ўсе ўдзельнікі інжынернага спрынту.

Тым часам я даходжу да самага адказнага этапу — падключэння сабранай машыны да камп'ютара і напісання алгарытму. Хоць насамрэч усе каманды, якія можа выканаць плата, аформлены ў выглядзе малюнкаў на экране ноўтбука. Мне застаецца толькі расставіць іх у правільным парадку. Цісну на «пуск», але птушкі цалкам лагічна круцяцца ў адзін бок. А каманды «круціць птушак у розныя бакі» ў інтэрфейсе праграмы няма. Рашэнне прыходзіць праз некалькі хвілін разважанняў — можна паставіць раменную перадачу «васьмёркай».

— Калі казаць пра глабальныя задачы школы, што я паставіў бы на першае месца вяртанне ў моладзі цікавасці да інжынерных прафесій, — працягвае Ігар Бялевіч. — Думаю, што для такой краіны, як наша, гэта вельмі актуальна. Мы імкнёмся зрабіць свае заняткі даступнымі для ўсіх, нашы цэны параўнальныя з аналагічнымі ў гуртках у дзяржаўных установах адукацыі, такіх як Рэспубліканскі цэнтр інавацыйнай і тэхнічнай творчасці.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Змахнуўшы пыл*

# ЭКСПАНАТЫ ЗАГАВАРЫЛІ ПА-НОВАМУ

**Што сярэднестатыстычны студэнт звычайна ведае пра сваю альма-матар? Год яе заснавання, колькасць факультэтаў, імя рэктара? Бывае, што і без гэтага абыходзяцца. А вось у БДЭУ ведам такога кшталту надаецца асаблівая ўвага: тут нядаўна адчыніў дзверы абноўлены музей гісторыі ўніверсітэта.**



Дырэктар музея Ала Ламаносава.

— Спачатку гэта быў музейны кабінет, які ў 1997 годзе стаў непасрэдна музеем, а цяпер, у Год культуры, атрымаў другое жыццё, — уводзіць у курс справы яго **дырэктар Ала ЛАМАНОСАВА** *(на здымку)*.

Яе аповед захапляе. Гэта не сухія звесткі, а жывая гісторыя ў асобах, якая вядзе адлік ад першага рэктара ўніверсітэта (тады дырэктара Інстытута народнай гаспадаркі). Да кожнага здымка і экспаната Ала Ламаносава дае каментарый. Спыняемся перад фота выпускнікоў даваеннага часу:

— Звярніце ўвагу, што тады на эканамістаў і бухгалтараў вучылася шмат хлопцаў і вельмі мала дзяўчат, — кажа яна і падыходзіць да вітрыны, дзе ляжаць пажоўклыя паперы. — А так выглядаў дыплом аб атрыманні вышэйшай эканамічнай адукацыі ў тыя часы. Дарэчы, тут пазначаны і дысцыпліны, якія вывучаліся. Можна параўнаць іх з тымі, што выкладаюцца ва ўніверсітэце сучасным студэнтам.

Пераходзячы ад аднаго стэнда да іншага, разглядаючы чорна-белыя, а пасля і каляровыя фотаздымкі, разумееш, што ў БДЭУ кожны факультэт і кафедра, навучальны корпус, інтэрнат і нават сталовая з'явіліся не выпадкова, а дзякуючы намаганням пэўных людзей. «Яны прысвяцілі сваё жыццё ўніверсітэту, таму кожны студэнт павінен ведаць пра іх», — упэўнена Ала Ламаносава.

Асаблівае месца ў музеі займае стэнд, звязаны са спартыўнымі дасягненнямі студэнтаў і выпускнікоў эканамічнага ўніверсітэта. Дыплом БДЭУ маюць такія славутыя спартсмены, як біятланістка Дар'я Домрачава, весляр Андрэй Багдановіч і іншыя.

— Ідэя музея — паказаць усе бакі жыцця нашага ўніверсітэта, пачынаючы з яго адкрыцця і да сучаснасці, — кажа **прарэктар па навуковай рабоце Генадзь КАРАЛЁНАК**, які курыраваў абнаўленне. — Мы стварылі савет музея, дзе абмяркоўваліся ўсе спрэчныя моманты. І хоць яны ў большай ступені датычыліся вонкавага выгляду, экспазіцыя таксама крыху змянілася — папоўнілася фотаздымкамі, пра існаванне якіх мы нават не здагадваліся, удакладніліся даты, з'явіліся новыя экспанаты.

Часцей за ўсё на экскурсіі сюды запрашаюць першакурснікаў, каб яны маглі бліжэй пазнаёміцца з навучальнай установай. Мне ж давялося трапіць у музей разам са студэнтамі апошняга курса, якія ўжо былі тут некалькі гадоў назад, а таму могуць параўнаць і ацаніць зробленую працу.

— Знешні выгляд музея, безумоўна, радуе вока. Раней гэта было даволі змрочнае памяшканне, дзе панавала «савецкая атмасфера». А цяпер усё па-сучаснаму, паўсюль шмат святла, таму на фотаздымкі і экспанаты глядзіш зусім па-новаму, — дзеліцца ўражаннямі **студэнтка ўлікова-эканамічнага факультэта Наталля ЦЫМБАЛІСТ**.

Яе **аднагрупніца Надзея СОГАВА** звярнула ўвагу на аповед экскурсавода:

— Мне здаецца, у гэты раз нам расказалі значна больш. Асабліва цікава было паслухаць пра падрабязнасці з жыцця студэнтаў і выкладчыкаў у першыя гады існавання ўніверсітэта. У зусім не простыя час гэтыя людзі думалі пра вучобу і навуку і, што галоўнае, дасягалі значных поспехаў! Таму нам сёння няма на што скардзіцца ў параўнанні з імі.

**Ганна КУРАК, студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Розныя — роўныя*

# ЗАЛАТАЯ «БРОНЗА»

**Студэнт другога курса Інстытута інфармацыйных тэхналогій БДУІР Аляксандр Антонаў заваяваў «бронзу» на IX міжнародным конкурсе прафесійных навыкаў асоб з абмежаванымі магчымасцямі International Abilympics, які прайшоў у Францыі. Конкурс сабраў 510 удзельнікаў з 35 краін.**

Беларус стаў трэцім у намінацыі «Адміністраванне і кіраванне сеткавай сістэмай».

— Заданне было дастаткова складанае. За тры гадзіны нам трэба было наладзіць камп'ютарныя сеткі і серверы. А на наступны дзень за гэткі ж час праз спецыяльную праграму змадэляваць і арганізаваць камп'ютарную сетку, — расказаў Аляксандр. — Лічу, сваёй узнагародай я даказаў, што людзі з асаблівымі патрэбамі могуць быць паспяховымі ў любых галінах. Галоўнае — жаданне, працавітасць і вера ў сябе.

У пяцёрку найлепшых у гэтай намінацыі ўвайшоў таксама студэнт шостага курса факультэта непарыўнага і дыстанцыйнага навучання БДУІР Яўген Салянаў.

У гэтых спаборніцтвах наша краіна ўдзельнічала ўпершыню і выступала толькі ў адной з пяцідзесяці чатырох намінацый. Першае месца ў ёй заняў прадстаўнік Паўднёвай Карэі, другое — француз.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Эх, каб яшчэ...*

# ВОПЫТ — ПАДМУРАК ПРАФЕСІІ

**Валянцін ГАЛУБЕЦ ужо чацвёрты год вучыцца ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце па спецыяльнасці «Прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва». Мінулым летам хлопцу давялося ўнесці свой уклад у будаўніцтва Астравецкай АЭС.**



Валянцін Голубеў (першы злева) падчас працы ў будатрадзе.

— Аб працы ў Астраўцы даведаўся ў БРСМ. Паколькі вясной мы ўжо былі там на практыцы, то прыблізна ведалі, што ды як. Вось і вырашылі з карысцю правесці летнія канікулы, зарабіць крыху грошай.

***— Што ўваходзіла ў твае абавязкі? Якія былі ўмовы?***

— На АЭС будаўнікі працуюць вахтавым метадам, наш будатрад — таксама. Вахтавы метад — гэта калі працуюць 14 дзён без выхадных па 12 гадзін на суткі. Працоўны дзень пачынаўся а 7-й раніцы. Нас забіраў аўтобус з горада і вёз на станцыю. Працавалі да 7 вечара. Потым той самы аўтобус адвозіў нас назад. У кватэры жылі дзевяць чалавек: сем студэнтаў і два рабочыя, таму ў ванны пакой і на кухню заўсёды была чарга.

Што тычыцца харчавання, то праблем не было, бо я жыў з аднагрупнікамі і гатаваць па чарзе было нескладана. Абед бралі з сабой у кантэйнерах. Калі-нікалі хадзілі ў сталовую на тэрыторыі станцыі. Выхадны быў толькі ў нядзелю.

***— Ці спадабалася працаваць?***

— Так, бо калектыў быў дружны. Я зарабіў амаль 9 мільёнаў. Штосьці на сябе патраціў, частку адклаў. Сёлета нас чакае абавязковая практыка, таму, думаю, яшчэ папрацуем на АЭС.

***— Як паставіліся бацькі да такога кроку?***

— Яны былі не супраць, каб я падчас канікул зарабіў грошай, хоць і далёка ад іх. Тым больш важна, што, прабыўшы на самай маштабнай будоўлі краіны два тыдні ў маі і яшчэ паўтара месяца ўлетку, пачынаеш разумець, чым будзеш займацца пасля вучобы. За гэты час я набыў шмат практычных ведаў плюс да тых тэарэтычных, якія мы атрымліваем ва ўніверсітэце. Гэта бясцэнны вопыт.

**Таццяна ЛАУШ, студэнтка III курса факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму ГрДУ ім. Я. Купалы.**

*Карані*

# ПАЧУЦЬ ШУМ ВЕНСКАГА ЛЕСУ,

## або Калі да прыроды — з любоўю

**Артур КОМАР, студэнт IV курса лесагаспадарчага факультэта Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, месяц стажыраваўся ў Аўстрыі ў інстытуце лесаводства Венскага ўніверсітэта.**

Летась беларусы ўдзельнічалі ў міжнароднай праграме па абмене студэнтамі IAESTE (International Assosiation of Exchange Students Technical experience). Абавязковыя ўмовы для прэтэндэнтаў — заканчэнне 3-6 семестраў навучання, добры ўзровень валодання англійскай мовай і актыўная жыццёвая пазіцыя. Толькі чатыры студэнты з БДТУ паспыталі «на смак» замежную адукацыю. Сярод іх Артур Комар з вёскі Бабраўнікі, што на Астравеччыне.

— У мяне выдатныя бацькі, якія заўсёды падтрымліваюць. Дзякуючы ім я і вызначыўся з будучай прафесіяй. Мама, Святлана, вельмі мяккая і добрая, па адукацыі бібліятэкар. Бацька ж, Юрый, рыбавод, працуе на сажалках. Для нас усіх было нечаканасцю, калі прапанавалі стажыроўку, — расказвае Артур. — Прыйшлося, вядома, папрацаваць: сабраць шмат дакументаў, напісаць матывацыйны ліст, удзельнічаць у двух гутарках па «Скайпе» на англійскай мове... І вось я ў Вене... Цудоўна, што на стажыроўцы было вельмі-вельмі шмат практыкі, я б назваў гэта нават працай... І ўсё на англійскай мове. Цікава, што лясгасаў там, як у нас, не існуе, бо лясы належаць прыватным асобам. Спачатку я вывучаў у інстытуце лесаводства інтрадукцыю дрэў (наўмыснае або выпадковае перасяленне відаў за межы іх натуральнага арэала). Ацэньваў, наколькі будзе эканамічна эфектыўным уводзіць гэтыя віды ў лясную гаспадарку Аўстрыі. Затым каля трох тыдняў праводзіў даследаванні ў лесе з дапамогай сучаснага электроннага абсталявання. Гэтая стажыроўка — велізарная практыка! Пашырылася агульнае развіццё, з'явіўся пэўны досвед. Таксама ўдасканаліў англійскую мову, бо да гэтага вучыў яе самастойна. А колькі ўсяго новага... У тым ліку і першы палёт на самалёце. Колькі новых знаёмстваў, колькі новых экзатычных відаў дрэў адкрыў я для сябе, неверагодна!

***— А як праводзіў вольны час?***

— Сястра Эмілія падарожнічала аўтастопам па еўрапейскіх краінах і вырашыла мяне наведаць. Дык мы ўсе выхадныя з ранку да вечара гулялі па Вене. Там ёсць на што паглядзець. Краіна запомнілася сваёй непаўторнай, адметнай прыгажосцю. Велічныя будынкі ствараюць асаблівы каларыт. Я ў захапленні ад сабора ў гонар Святога Штэфана!

Яшчэ я вельмі люблю спорт — зноў жа, дзякуючы бацькам. Таму бегаў, купаўся ў Дунаі, хадзіў у кавярню глядзець футбол. Вечары часам бавілі разам з іншымі практыкантамі...

***— Артур, магчыма, ты браў удзел яшчэ ў нейкіх замежных праектах?***

— Адразу пасля стажыроўкі ўдзельнічаў у адукацыйным праекце «Летняя акадэмія» ў Германіі — у рамках супрацоўніцтва паміж БДТУ, Універсітэтам Эберсвальдэ (Германія) і Беластоцкім універсітэтам (Польшча). З кожнага было па 10 студэнтаў. Нас падзялілі на пяць груп і далі па пэўнай тэме. Нам дастаўся «Маніторынг лясной экасістэмы». Вось там і спатрэбіўся вопыт, прывезены з Аўстрыі. Вядома, была спланавана і праграма для адпачынку. Жылі мы ў Нацыянальным парку на рацэ Одэр. Спускаліся па ім на каноэ праз нацыянальны парк, падарожнічалі на веласіпедах, гулялі па Берліне, наведалі Рэйхстаг, рэзідэнцыю прускіх каралёў у Патсдаме. З Аўстрыі я прывёз вопыт, а з Германіі — шмат прыемных уражанняў. Ну і, безумоўна, новыя кантакты.

***— А што далей?***

— Хачу ажаніцца з самай цудоўнай і мілай дзяўчынай, з якой вучымся на адным факультэце *(усміхаецца)*. А так... Калі будзе магчымасць, то з радасцю з'езджу яшчэ на стажыроўку. Буду працаваць. Мне здаецца, што праца ў лесе і з лесам яднае з прыродай. Магчыма, вярнуся на сваю маленькую «лясную» радзіму...

**Юлія БУКЕЛЬ, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**



Фота Эміліі КОМАР.

# З ГАЛАВОЙ У РАБОЦЕ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння якраз дзень «не зусім профільнай» работы. Галоўная задача вадалазаў — забеспячэнне працы службы хімічнай і радыяцыйнай абароны, а таксама правядзенне замераў канцэнтрацыі небяспечнага рэчыва ў вадзе. Уцечку нафты ліквідуюць пры дапамозе сарбенту — спецыяльнай сумесі, якая звязвае «чорнае золата» і выцягвае яго з вады. Штодзень ратаўнікі высыпаюць рэчыва ў канал, пасля чаго да так званых бонаў — плывучых загарод на акваторыі — прыбіваюцца вялікія «камякі» сабранай нафты. Боны прыцягваюць да берага, а адпрацаваны сарбент збіраюць у спецыяльныя мяхі.


Цяпер мы ўжо ведаем, што Павел і яго калегі не ныраюць, а апускаюцца!

## ХАДЗІЦЬ І АПУСКАЦЦА

Пакуль калегі Паўла рыхтуюцца, малады чалавек тлумачыць нам некаторыя тонкасці працы вадалаза. Адкрыўшы салон мікрааўтобуса, ён распавядае нам пра розніцу паміж гідракасцюмамі, якія захоўваюцца тут.

**«Усё-такі мора — гэта зусім іншая гісторыя. У беларускіх азёрах і рэках часам бачнасць такая, што кісць выцягнутай рукі не відаць».**

— Вось гэта — самы просты, «мокры» гідракасцюм, — кажа суразмоўца. — Гэта значыць, што пад яго трапляе вада, але калі ён добра падыходзіць па памеры, то назад вада ўжо амаль не выходзіць. Цела яе награвае, і вадалаз не мерзне. Ёсць яшчэ «паўсухі» касцюм — ён аснашчаны спецыяльнымі ўшчыльненнямі, якія змяншаюць кантакт вады з целам. А самы прасунуты — «сухі» касцюм. У ім выкарыстоўваюцца тыя ж ушчыльненні, герметычныя «бегункі» і іншыя дэталі, якія амаль не прапускаюць ваду. Звычайна ў такіх працуюць узімку, калі трэба максімальна абараніць вадалаза ад уздзеяння нізкай тэмпературы.

Тут жа праходзім і лікбез па тэрміналогіі. «Мы не ныраем, а апускаемся, — усміхаецца Павел. — Дарэчы, добрым плыўцом вадалазу быць неабавязкова, бо мы пераважна ходзім па грунце».

Па словах ратаўніка, апранаць гідракасцюмы даводзіцца не так часта, як гэта ўяўляецца. Вадалазы працуюць па графіку суткі праз трое. На дзяжурства заступаюць каманды з трох чалавек, якія заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу ў экстранных сітуацыях. Праўда, здараецца такое нячаста. Справа ў тым, што атрад базуецца не на акваторыі, да самага блізкага буйнога вадаёма — Вілейскага вадасховішча — 25 кіламетраў. Звычайна змены праходзяць спакойна, але гэта не значыць, што вадалазы проста «адседжваюць» працоўны час.

— Для пацвярджэння сваёй кваліфікацыі мы павінны за год набраць пэўную колькасць гадзін апусканняў: нехта 60, нехта 90, — кажа Павел. — Для гэтага прыкладна раз на тыдзень праводзяцца вучэбныя спускі. Апускаемся ў басейне і на адкрытай вадзе незалежна ад сезона, як летам, так і ўзімку. Калі выконваеш гэты план і здаеш усе экзамены (яны таксама праводзяцца штогод), атрымліваеш дазвол працаваць далей. Пішам канспекты, займаемся самападрыхтоўкай — няважна, год ты працуеш ці дваццаць. Акрамя таго, калі ёсць патрэба, нас могуць выклікаць і на тушэнне пажараў, бо першапачатковую падрыхтоўку ўсе праходзяць аднолькавую.

## АД МЯЧА ДА ЭКСКАВАТАРА

Тым часам калегі Паўла пачынаюць працу. Перабіраюцца на другі бераг, адчэпліваюць боны, акуратна перацягваюць іх на адзін бок канала. Сярод камякоў нафты з сарбентам заўважаем яркі прадмет — чырвоны гумовы мячык.

— У нас хутка будзе цэлая калекцыя такіх, — смяецца адзін з вадалазаў. — Футбольныя і іншыя мячы — пэўна, самая частая наша знаходка. Збіраем іх, а потым выкарыстоўваем як абмежавальныя буі на вадаёмах.

Пытаемся, што яшчэ можна знайсці на дне. Па словах ратаўнікоў, часта трапляюцца рознага роду прылады для плавання — ласты, трубкі, маскі... Але бываюць і ўнікальныя знаходкі. Аднойчы на дне ракі адшукалі каштоўны чайны сервіз, зроблены ў Крыме. Пад тоўшчай вады хаваюцца не толькі дробныя рэчы. Нярэдка ратаваць прыходзіцца буйную тэхніку. Якраз непадалёк на адным з кар'ераў пад ваду пайшлі... смеццявоз і два экскаватары. Шматтонныя машыны трэба было абвязаць стропамі, ачысціць ад глею і грунту, якім іх засыпала пры абвале, і падняць на паверхню.


Гідракасцюм і акваланг — без іх не абысціся, але карыстацца даводзіцца не вельмі часта.


Фота Надзеі БУЖАН.
Вадалазы заўсёды працуюць у пары: адзін на вадзе, другі — падстрахоўвае.

## ГАДЗІНЫ Ў КНІЖЦЫ...

— Пасля школы я паступіў у політэхнічны каледж у Маладзечне, а потым у Гомельскі інжынерны інстытут МНС на спецыяльнасць «інжынер па папярэджанні і ліквідацыі НС» завочнага аддзялення. Праца ратаўніка натхняла, магічна, з-за авантурнага характару, — смяецца хлопец. — На першым курсе мне патэлефанавалі з аддзела кадраў Маладзечанскага аддзела па надзвычайных сітуацыях і прапанавалі работу. Так у 19 гадоў я пайшоў працаваць ратаўніком.

Раней у Маладзечне дыслацыравалася звычайная пажарна-аварыйная ратавальная часць. Некалькі гадоў таму было вырашана стварыць у Мінскай вобласці спецыяльны атрад, у склад якога ўвайшлі ўжо і такія службы, як медыцынская, выбуховатэхнічная, хімічнай і радыяцыйнай абароны і, нарэшце, — вадалазна-ратавальная. Пачалі праводзіць адбор кандыдатаў у кожную з іх. Да патэнцыяльных вадалазаў прад'явілі вельмі сур'ёзныя патрабаванні, асабліва ў плане здароўя. Але Павел вырашыў падацца менавіта туды.

— Працэс навучання для працы ў вадалазна-ратавальнай службе самы цікавы з усіх, якія ёсць у МНС, — кажа Павел. — Узяць, напрыклад, тэорыю: мы пісалі канспекты па ўмоўных абазначэннях, якімі карыстаюцца вадалазы, практыкаваліся ў апусканнях у самым розным рыштунку — усё гэта незвычайна для Беларусі. Пасля здачы экзаменаў атрымалі спецыяльны дакумент — вадалазныя кніжкі. Там фіксуецца кваліфікацыя (я, напрыклад, вадалаз другога класа, а першы даюць інструктарам) і колькасць адпрацаваных гадзін.

## ...І АДПАЧЫНАК ПАД ВАДОЙ

Трэба сказаць, што беларускіх вадаёмаў Паўлу не заўсёды хапае. Хлопец распавядае, як пэўны час з таварышам працаваў на Камчатцы — дапамагаў расійскім калегам падымаць затанулыя караблі (звычайна пагранічныя катэры і рыбалавецкія судны) з фарватару. Дарэчы, менавіта там Павел паставіў уласны рэкорд глыбіні апускання — 23 метры. Ды і сам від работы быў больш складаным, чым на радзіме, — даводзілася займацца падводнай зваркай, рэзкай і іншым.

**Непадалёк на адным з кар'ераў пад ваду пайшлі... смеццявоз і два экскаватары. Шматтонныя машыны трэба было абвязаць стропамі, ачысціць ад глею і грунту, якім іх засыпала пры абвале, і падняць на паверхню.**

— Усё-такі мора — гэта зусім іншая гісторыя, — кажа Павел. — У беларускіх азёрах і рэках часам бачнасць такая, што кісць выцягнутай рукі не відаць. А там — прыгажосць.

Дарэчы, адпачынак Паўла таксама ў пэўным сэнсе звязаны з вадой — часам хлопец можа з'ездзіць на падводную рыбалку. Акрамя таго, у атрадзе ёсць свая вялікая спартыўная зала... А яшчэ свой вольны час Павел прысвячае жонцы і сямімесячнай дачцэ.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*РАЗМЕРКАВАННЕ*

# МЕСЦА «ПАД СОНЦАМ»,

## ці Проста першы вопыт?

**Пасля заканчэння ўніверсітэта студэнты бюджэтнай формы навучання павінны адпрацаваць два гады. Не кожнаму маладому спецыялісту шанцуе адразу атрымаць тое, што ён жадаў і пра што марыў, але і задаволеных першым працоўным месцам таксама дастаткова...**

**Надзея РУБЦЭВІЧ:** — Пазалетась я скончыла факультэт камп'ютарных сістэм і сетак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі па спецыяльнасці «Вылічальныя машыны, сістэмы і сеткі». Уладкавалася ў JVL-карпарацыю. Мне падабаецца месца адпрацоўкі. Тут добры калектыў, цікавыя задачы, нармальны заробак. Не трэба прыходзіць на працу а 8-й раніцы, галоўнае — адпрацаваць 40 гадзін за тыдзень. Пакуль не збіраюся змяняць гэта месца.

**Антось ТКАЧУК:** — Вучыўся на механіка-матэматычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі. Для размеркавання сам знайшоў працу ў прыватнай аўтамабільнай кампаніі. Яна падабалася, таму што быў добры калектыў. Месца я ўжо змяніў, бо тэрмін адпрацоўкі скончыўся, а працаваць надалей там мне не хацелася. На мой погляд, я вычарпаў на гэтай працы ўвесь свой патэнцыял. А цяпер шукаю сябе. Можна сказаць, што я «вольны чалавек», фрылансер.

**Вольга ПАЎЛЮКЕВІЧ:** — Была студэнткай філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які скончыла летась. Зараз працую ў Цэнтры візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпарэйшн», гэта, калі прасцей, дырэкцыя кінафестывалю «Лістапад». Туды размяркоўвалася на пасаду рэдактара сайта свядома. Была гутарка, напісала тэставае заданне, усіх яно задаволіла, і мяне ўзялі. Мне падабаецца, бо я займаюся тым, што ў мяне атрымліваецца; кажуць нават, што нядрэнна. Ёсць мінусы, але плюсы пераважваюць, прынамсі пакуль. Людзі творчыя, праца цікавая. Але я не прыйшла зніадкуль. Што датычыцца фестывалю, дык на ім я працавала перакладчыцай і была валанцёрам тры гады, таму мяне ў дырэкцыі ўжо крыху ведалі.

**Юлія СУРМА:** — Паля заканчэння будаўнічага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта працую ў будаўнічай фірме. Кантора прыватная, умовы працы мне здаюцца зручнымі: няма фіксаванага пачатку і канца рабочага дня (праўда, як і часу абеду), форма адзення — свабодная. У будучыні хацела б змяніць гэта месца, бо трэба расці, ну і заробак, вядома, хацелася б атрымліваць больш высокі.

**Ганна ДУДЗІНСКАЯ:** — Вышэйшую адукацыю атрымлівала ў Інстытуце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які скончыла два гады таму. Шчыра прызнаюся, што месца для размеркавання пачала шукаць толькі на пятым курсе, да гэтага падпрацоўвала ў абсалютна іншай сферы. На пераддыпломную практыку прапанавалі пайсці ў радыёвузел ААТ «Інтэграл» з магчымасцю далейшага працаўладкавання. Так я стала рэжысёрам радыёвяшчання, а на справе — адзіным супрацоўнікам радыёвузла. Штодня выпускаю перадачу па заяўках, сумяшчаючы працу вядучага і гукарэжысёра, раблю аб'явы і штотыднёвую радыёпраграму навін. Апошні год падпрацоўваю яшчэ і ў карпаратыўнай газеце. Летась у жніўні абавязковая адпрацоўка скончылася, але я засталася: мне падабаюцца ўмовы, калектыў, задавальняе і заробатная плата. У мяне нармаваны графік, свой кабінет і свабода творчасці — можна ўвасабляць любыя ідэі. Але ў будучыні змяню месца — пра гэта я ўжо даўно папярэдзіла свайго кіраўніка. Прычына ў тым, што кар'ерная «лесвіцы» тут няма зусім, тэматыка занадта вузкая, каб займацца ёю ўсё жыццё і не стаміцца ад аднастайнасці.

**Настасся ЖУХАРАВА,**
**студэнтка IV курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
5 05 2016 г.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | автомобиль МАЗ 543205-226, гос. номер AI 8462-4, 2006 г.в. (2-осный седельный тягач, двигатель Д238, пробег 228 700 км) |
| Начальная цена продажи | 29 873 030 (двадцать девять миллионов восемьсот семьдесят три тысячи тридцать) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 2 987 303 (два миллиона девятьсот восемьдесят семь тысяч триста три) белорусских рубля |
| **ЛОТ 2** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | автомобиль МАЗ 543205-220, гос. номер CI 5636, 2006 г.в. (2-осный седельный тягач, двигатель Д238, пробег 225 600 км) |
| Начальная цена продажи | 29 554 873 (двадцать девять миллионов пятьсот пятьдесят четыре тысячи восемьсот семьдесят три) белорусских рубля без учета НДС |
| Сумма задатка | 2 955 487 (два миллиона девятьсот пятьдесят пять тысяч четыреста восемьдесят семь) белорусских рублей |
| **ЛОТ 3** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | автомобиль МАЗ 543205-220, гос. номер АА 1824-4, 2007 г.в. (2-осный седельный тягач, двигатель Д238, пробег 312 500 км) |
| Начальная цена продажи | 32 618 420 (тридцать два миллиона шестьсот восемнадцать тысяч четыреста двадцать) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 3 261 842 (три миллиона двести шестьдесят одна тысяча восемьсот сорок два) белорусских рубля |
| **ЛОТ 4** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | автомобиль МАЗ 543205-226, гос. номер СМ 6378, 2006 г.в. (2-осный седельный тягач, двигатель Д238, пробег 303 000 км) |
| Начальная цена продажи | 29 927 211 (двадцать девять миллионов девятьсот двадцать семь тысяч двести одиннадцать) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 2 992 721 (два миллиона девятьсот девяносто две тысячи семьсот двадцать один) белорусский рубль |
| **ЛОТ 5** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | автоцистерна МАЗ 533702-241 АЦ-10, гос. номер СМ 6975, 2007 г.в. (автоцистерна 10 м.куб. для перевозки нефтепродуктов на шасси 2-осного автомобиля с двигателем Д236, пробег 247 700 км) |
| Начальная цена продажи | 34 726 094 (тридцать четыре миллиона семьсот двадцать шесть тысяч девяносто четыре) белорусских рубля без учета НДС |
| Сумма задатка | 3 472 609 (три миллиона четыреста семьдесят две тысячи шестьсот девять) белорусских рублей |
| **ЛОТ 6** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | автомобиль ГАЗ 2705 Газель, гос. номер АВ 1719-4, 2008 г.в. (грузовой фургон с цельнометаллическим 3-дверным кузовом, грузоподъемностью 1,5 т, газ-бензин, пробег 224 000 км) |
| Начальная цена продажи | 10 702 952 (десять миллионов семьсот две тысячи девятьсот пятьдесят два) белорусских рубля без учета НДС |
| Сумма задатка | 1 070 295 (один миллион семьдесят тысяч двести девяносто пять) белорусских рублей |
| **ЛОТ 7** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | автомобиль ГАЗ 2705 Газель, гос. номер АА 0214-4, 2006 г.в. (грузовой фургон с цельнометаллическим 3-дверным кузовом, грузоподъемностью 1,5 т, газ-бензин, пробег 374 000 км) |
| Начальная цена продажи | 9 164 633 (девять миллионов сто шестьдесят четыре тысячи шестьсот тридцать три) белорусских рубля без учета НДС |
| Сумма задатка | 916 463 (девятьсот шестнадцать тысяч четыреста шестьдесят три) белорусских рубля |
| **ЛОТ 8** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | полуприцеп-цистерна ППЦ-22, гос. номер А 0757 А-4, 2006 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 м.куб., разрешенная масса 36 т, пробег 224 000 км.) |
| Начальная цена продажи | 47 822 003 (сорок семь миллионов восемьсот двадцать две тысячи три) белорусских рубля без учета НДС |
| Сумма задатка | 4 782 200 (четыре миллиона семьсот восемьдесят две тысячи двести) белорусских рублей |
| **ЛОТ 9** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | полуприцеп-цистерна ППЦ-22 МАЗ 9919 00-012, гос. номер 1043 АА-4, 2006 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 м.куб., разрешенная масса 36 т, пробег 272 000 км) |
| Начальная цена продажи | 55 458 818 (пятьдесят пять миллионов четыреста пятьдесят восемь тысяч восемьсот восемнадцать) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 5 545 882 (пять миллионов пятьсот сорок пять тысяч восемьсот восемьдесят два) белорусских рубля |
| **ЛОТ 10** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | полуприцеп-цистерна ППЦ-22 МАЗ 9919, гос. номер С 0352 А, 2006 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 м.куб., разрешенная масса 29,7 т, пробег 254 000 км) |
| Начальная цена продажи | 48 858 581 (сорок восемь миллионов восемьсот пятьдесят восемь тысяч пятьсот восемьдесят один) белорусский рубль без учета НДС |
| Сумма задатка | 4 885 858 (четыре миллиона восемьсот восемьдесят пять тысяч восемьсот пятьдесят восемь) белорусских рублей |
| **ЛОТ 11** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | полуприцеп-цистерна ППЦ-22-9397, гос. номер 6303 СА, 2000 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 м.куб., разрешенная масса 26,8 т, пробег 331 000 км) |
| Начальная цена продажи | 5 854 335 (пять миллионов восемьсот пятьдесят четыре тысячи триста тридцать пять) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 585 434 (пятьсот восемьдесят пять тысяч четыреста тридцать четыре) белорусских рубля |
| **ЛОТ 12** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | полуприцеп-цистерна ППЦ-22 МАЗ 9919, гос. номер А 1233 А-4, 2006 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки нефтепродуктов на 3-осном шасси, емкость 22 м.куб., разрешенная масса 36 т, пробег 223 000 км) |
| Начальная цена продажи | 48 604 327 (сорок восемь миллионов шестьсот четыре тысячи триста двадцать семь) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 4 860 433 (четыре миллиона восемьсот шестьдесят тысяч четыреста тридцать три) белорусских рубля |
| **ЛОТ 13** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | полуприцеп-цистерна ППЦТ-20, гос. номер А 1240 А-4, 2006 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки сжиженного углеводородного газа на 2-осном шасси, емкость 20 м.куб., разрешенная масса 20,1 т, пробег 405 000 км) |
| Начальная цена продажи | 86 788 389 (восемьдесят шесть миллионов семьсот восемьдесят восемь тысяч триста восемьдесят девять) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 8 678 839 (восемь миллионов шестьсот семьдесят восемь тысяч восемьсот тридцать девять) белорусских рублей |
| **ЛОТ 14** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | полуприцеп-цистерна ППЦТ-20, гос. номер А 1214 А-4, 2005 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки сжиженного углеводородного газа на 2-осном шасси, емкость 20 м.куб., разрешенная масса 19,7 т, пробег 378 000 км) |
| Начальная цена продажи | 35 700 190 (тридцать пять миллионов семьсот тысяч сто девяносто) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 3 570 019 (три миллиона пятьсот семьдесят тысяч девятнадцать) белорусских рублей |
| **ЛОТ 15** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | полуприцеп-цистерна ППЦТ-20, гос. номер А 0711 А-4, 2005 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки сжиженного углеводородного газа на 2-осном шасси, емкость 20 м.куб., разрешенная масса 19,7 т, пробег 333 000 км) |
| Начальная цена продажи | 43 578 584 (сорок три миллиона пятьсот семьдесят восемь тысяч пятьсот восемьдесят четыре) белорусских рубля без учета НДС |
| Сумма задатка | 4 357 858 (четыре миллиона триста пятьдесят семь тысяч восемьсот пятьдесят восемь) белорусских рублей |
| **ЛОТ 16** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | полуприцеп-цистерна ППЦТ-20, гос. номер 6925 СВ 2006 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки сжиженного углеводородного газа на 2-осном шасси, емкость 20 м.куб., разрешенная масса 20,1 т, пробег 405 000 км) |
| Начальная цена продажи | 34 629 407 (тридцать четыре миллиона шестьсот двадцать девять тысяч четыреста семь) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 3 462 940 (три миллиона четыреста шестьдесят две тысячи девятьсот сорок) белорусских рублей |
| **ЛОТ 17** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | МАЗ 892600 1020-001р ПЦ-8 прицеп-цистерна, гос. номер А 1025 А-4, 2007 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки нефтепродуктов на раме 2-осного прицепа, емкость 8 м.куб., разрешенная масса 12 т, пробег 119 000 км) |
| Начальная цена продажи | 28 935 758 (двадцать восемь миллионов девятьсот тридцать пять тысяч семьсот пятьдесят восемь) белорусских рублей без учета НДС |
| Сумма задатка | 2 893 576 (два миллиона восемьсот девяносто три тысячи пятьсот семьдесят шесть) белорусских рублей |
| **ЛОТ 18** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | МАЗ 892600 прицеп-цистерна ПЦ-8, гос. номер А 1033 А-4, 2007 г.в. (стальная автоцистерна для перевозки нефтепродуктов на раме 2-осного прицепа, емкость 8 м.куб., разрешенная масса 12 т, пробег 192 000 км) |
| Начальная цена продажи | 29 441 024 (двадцать девять миллионов четыреста сорок одна тысяча двадцать четыре) белорусских рубля без учета НДС |
| Сумма задатка | 2 944 102 (два миллиона девятьсот сорок четыре тысячи сто два) белорусских рубля |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | РУП «Белоруснефть-Гроднооблнефтепродукт», 230005, г. Гродно, ул. Дзержинского, 96, тел. 45-27-03, 41-24-81 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия оплаты | - возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5% от конечной цены продажи объекта;<br>- 100% предоплата за приобретаемый объект |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 06 июня 2016 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209,
с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 01 июня 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32–
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,
http://grodnoino.by/**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | - капитальное строение, инв. № 430/С-17324 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание травильного отделения), площадью 590,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Советская, 40А/3.<br>- капитальное строение, инв. № 430/С-52832 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – здание склада), площадью 397,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Советская, 40А.<br>- капитальное строение, инв. № 430/С-14056 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – проходная), площадью 25,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Советская, 40А/1.<br>- капитальное строение, инв. № 430/С-14055 (назначение – здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции, наименование – склад), площадью 29,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Советская, 40А/2.<br>- капитальное строение, инв. № 430/С-53544 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – линия электропередачи), протяженностью 277,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Советская, 40А.<br>- капитальное строение, инв. № 430/С-53542 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – ливневая канализационная сеть), протяженностью 90,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Советская, 40А.<br>- капитальное строение, инв. № 430/С-53546 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 62,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Советская, 40А.<br>- капитальное строение, инв. № 430/С-53545 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 96,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Советская, 40А.<br>- кран-балка грузоподъемностью 2т. (инв. № 421822);<br>- кран-балка грузоподъемностью 2т. (инв. № 421823);<br>- электроталь ВЗИ грузоподъемностью 2 т. (инв. № 422017);<br>- электроталь ВЗИ грузоподъемностью 2 т. (инв. № 422022) |
| Земельный участок, на котором расположен объект | Кадастровый номер 424350100001005314, (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений), площадью 0,6943, расположенном по адресу: г. Новогрудок, ул. Советская, 40А |
| Начальная цена продажи | 2 452 736 400 (два миллиарда четыреста пятьдесят два миллиона семьсот тридцать шесть тысяч четыреста) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 245 273 640 (двести сорок пять миллионов двести семьдесят три тысячи шестьсот сорок) белорусских рублей |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | ОАО «Новогрудский завод металлоизделий» 231400, г. Новогрудок, ул. Мицкевича, 37 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия оплаты | - расчет по договору купли-продажи в течение 5 банковских дней с даты подписания договора;<br>- возмещение Победителем аукциона затрат по услугам Новогрудского филиала РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» и Гродненского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки» в размере 70 691 863 рублей с учетом НДС;<br>- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 3% от конечной цены продажи объекта |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 07 июня 2016 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209,
с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 01 июня 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

## ОРГАНИЗАТОР: КАМЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| № лота | Вид аукциона, целевое назначение | Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер | Условия и ограничения | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома | д. Макаровщина, ул. Алексея Ладика, У-8А Лепельского района, площадь 0.1990 га, кадастровый номер 222781708601000042 | - водоохранная зона озера «Макаровское»;<br>- получение победителем в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство | 20 000 000 | 2 000 000 |

1. **Аукцион состоится 10 июня 2016 года в 15.00 по адресу: Витебская область, Лепельский район, агрогородок Камень, улица Ленинградская-25а.**

2. **Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: агрогородок Камень, улица Ленинградская-25а, Каменский сельский исполнительный комитет. Последний день приема заявлений – 06.06.2016 года до 17.00.**

3. К участию допускаются граждане РБ, подавшие заявление установленной формы, внесшие задаток в размере 10% от начальной цены объекта аукциона в кассу Каменского сельисполкома.

4. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования.

Представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, удостоверяющую личность, а также предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, и копии платежных документов, подтверждающих уплату залога.

5. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, публикацию в средствах массовой информации и расходов по подготовке и изготовлению документации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о передаче в частную собственность победителю аукциона земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

Контактные телефоны: 8(02132) 2-39-62; 8 (029) 713-99-41.

*Бачыць мэту!*

# Найлепшыя юрысты-міжнароднікі вучацца ў БДУ

**Упершыню каманда студэнтаў БДУ заваявала «серабро» на конкурсе па міжнародным праве імя Філіпа Джэсапа (Jessup International Law Moot Court Competition) у Вашынгтоне.**

Гэта самыя прэстыжныя ў свеце спаборніцтвы па міжнародным публічным праве, свайго роду «алімпійскія гульні» сярод будучых юрыстаў. Яны праводзяцца, пачынаючы з 1957 года. Усяго сёлета ў ЗША выступілі 132 каманды з 86 краін свету.

У склад каманды БДУ ўвайшлі студэнткі факультэта міжнародных адносін Тацццяна Зінякова, Лізавета Тарасевіч, Лізавета Трахалінава, Кацярына Шкарбута і Алена Хадарцэвіч. Ганаровае другое месца студэнткам ФМА БДУ прынесла намінацыя «Пісьмовае выкладанне прававой аргументацыі».

Конкурсныя заданні на спаборніцтвах па міжнародным праве капіруюць мадэль судовага разбору ў Міжнародным судзе ААН. Беларускія дзяўчаты распрацавалі тактычныя метады абароны і абвінавачвання па тэму злачыннасці ў кіберпрасторы і выклалі іх на англійскай мове. Тэарэтычная праца была ўхвалена журы і заняла другое месца сярод цэлага шэрагу прапанаваных праектаў ад камандаў вядучых ВНУ з сусветнымі імёнамі. Нашы суайчынніцы пакінулі ззаду студэнтаў Калумбійскай школы права ЗША, Каралеўскага каледжа Лондана, Нью-Ёркскага ўніверсітэта, Нацыянальнага ўніверсітэта Сінгапура, Аўстралійскага нацыянальнага ўніверсітэта, саступіўшы ў прафесіяналізме толькі камандзе студэнтаў з Ізраіля.

У другой, вуснай, частцы спаборніцтваў студэнткі ФМА БДУ паказалі таксама бліскучы вынік — найлепшы за ўсю гісторыю ўдзелу беларускіх студэнтаў у гэтых спаборніцтвах за акіянам. Пасля публічных спрэчак каманда БДУ выйшла ў 1/8 фіналу, трапіўшы ў ТОП-16. Нашы дзяўчаты з бляскам абгулялі студэнтаў элітнай расійскай ВНУ — Вышэйшай школы эканомікі, але саступілі сапернікам з Нью-Ёркскага ўніверсітэта (ЗША).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Ведай нашых!*

# МАТЭМАТЫКА ЦІКАВАЯ І ДЛЯ ДЗЯЎЧАТ

**Чатыры медалі заваявалі беларускія старшакласніцы на V Еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе сярод дзяўчат у Румыніі. Удзел у сёлетнім спаборніцтве прынялі 39 каманд з розных краін.**

Скарбонку беларускай зборнай папоўнілі вучаніца 11 класа мінскай гімназіі №41 Лізавета Манжуліна (у яе сярэбраны медаль), дзевяцікласніца гэтай жа гімназіі Арына Галубіцкая, адзінаццацікласніца ашмянскай сярэдняй школы №2 Кацярына Кунц і адзінаццацікласніца Ліцэя БДУ Святлана Шабан, якія заваявалі бронзавыя ўзнагароды.

Па ўмовах алімпіяды ў камандзе кожнай краіны могуць быць прадстаўлены чатыры чалавекі. Дзяўчаты спаборнічаюць два дні, у кожны з якіх ім прапануецца рашыць па тры задачы. Таленавітых беларусак падрыхтаваў выкладчык матэматыкі Ліцэя БДУ Міхаіл Карпук.

Міжнародныя матэматычныя алімпіяды (ММА) праводзяцца, пачынаючы з 1959 года. Але, як правіла, большасць удзельнікаў такіх алімпіяд складаюць хлопцы. У 2012 годзе ў Кембрыджы ўпершыню правялі Еўрапейскую матэматычную алімпіяду для дзяўчат. Удзел у ёй прынялі каманды з 16 краін Еўропы і 3 каманды з іншых рэгіёнаў.

Беларусь удзельнічала ў гэтых прэстыжных спаборніцтвах чатыры разы. Самым паспяховым аказаўся 2013 год, калі навучэнкі нашай краіны заваявалі тры залатыя і адзін бронзавы медалі, заняўшы першае агульнакаманднае месца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Выпрабавана на сабе*

# ЯК МЫ НА ПРЫВІДАЎ ПАЛЯВАЛІ,

## ці Хто можа дамовіцца з палтэргейстамі

**Аматары кіно 1980-х ніяк не дачакаюцца ліпеня — менавіта ў гэтым месяцы на экранах з'явіцца працяг эпахальнай дылогіі «Паляўнічыя на зданяў». Мастацтва — гэта выдатна, але ці ведаеце вы, што такія паляўнічыя існуюць... і ў нас? Нядаўна нашы карэспандэнты пазнаёміліся з беларускімі «Паляўнічымі на прывідаў» (менавіта так, а не як у фільме) і нават паўдзельнічалі ў іх выездзе да кліента.**

### Узброеныя «Ракетніцай»

...Увечары мы чакаем каманду «Паляўнічых» у дамоўленым месцы. Перад сустрэчай з незямным натхняемся саўндтрэкам Рэя Паркера з таго самага фільма. Але весялосць і смех знікаюць, калі неба раптам зацягвае чорнымі хмарамі і пачынае збірацца навальніца. Нядобры знак? Недзе ў падсвядомасці ўзнікае настойлівае жаданне адмяніць сустрэчу. Але прывідаў баяцца — на паляванне не хадзіць.

Нарэшце з-за сцяны дажджу выязджае чорны міні-вэн, не надта падобны да «кадзілака» з фільма, але таксама «атмасферны». Усе члены каманды «пры парадзе»: чорныя байкі з назвай каманды на спіне і лагатыпам на грудзях — шчытом, на адной палове якога злосная здань, а на другой, відавочна, ужо пераможаная. «Ага, яны будуць у ахоўных касцюмах, а мы што?» — праносіцца ў галаве.

Знаёмімся. За рулём машыны, ідэйны натхняльнік і галоўны «паляўнічы» — Дзмітрый Нікулін, менавіта з яго распачалася гісторыя беларускіх «гастбастараў». Побач — Цімафей, яго ў камандзе завуць «Ракетніцай». Па словах Дзмітрыя, менавіта на гэтага хлопца ўскладзена пераважная частка непасрэднай працы з прывідамі. А вось далей пачынаюцца разыходжанні з Галівудам, бо астатнія члены каманды — дзяўчаты. Спецыялізацыя Настассі — карты Таро. А вось пра профіль працы Марыі каманда расказваць адмаўляецца, ствараючы тым самым дадатковую таямнічасць. Заўважу толькі, што падчас «палявання» дзяўчына ў асноўным была занятая здымкай відэа на камеру смартфона.

### Без фільма — ніяк

— Менавіта ў якасці «Паляўнічых на прывідаў» мы афарміліся нядаўна — прыкладна два месяцы таму, — дзеліцца Дзмітрый, пакуль мы едзем на месца. — Да гэтага ў кожнага быў нейкі свой досвед сутыкнення з тагасветным. Мяне раней ведалі па даследаваннях у сферы эзатэрыкі, якімі я займаўся, гэтыя людзі і былі першымі кліентамі. А ўвогуле, я працаваў у сферы будаўніцтва, прычым займаўся даволі буйнымі аб'ектамі. Пакуль выклікаў не вельмі шмат: недзе раз на тыдзень. Але едзем не да кожнага — калі я па тэлефоне чую, што чалавек не зусім адэкватны, то разумею, што гэта марнаванне часу і для яго, і для нас.

Астатнія члены каманды — студэнты. Цімафей вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі, Настасся — у Беларускім дзяржаўным універсітэце. Марыя засталася вернай сваёй таямнічасці і пра месца ўласнага навучання так нічога і не сказала.

Што ж датычыцца прадмета даследаванняў, дык, як патлумачыў Дзмітрый, ніякай цэласнай сістэмы ведаў пра прывідаў не існуе. Усе яго асабістыя перакананні заснаваны на глебе ўласнага досведу і здагадак. Па словах суразмоўцы, на яго асабістую філасофію паўплывалі такія рэчы, як славянскае паганства, сустрэчы з «прафесіяналамі», паездкі на «месцы Сілы», і... усё той жа фільм «Паляўнічыя на зданяў».



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Падчас «структуравання прасторы» Дзмітрый быццам бы увайшоў у транс.

### Загадкавае люстэрка

— Сёння ў нас даволі просты выклік, — кажа Дзмітрый. — Але я не люблю загадваць. Часам, калі думаеш, што праблема дробязная, на месцы ўсё аказваецца нечакана складаным. Нават большасць нашых кліентаў не ведае, якую цяжкую працу для іх мы зрабілі, бо няма сэнсу расказваць так шмат чалавеку, які «не ў тэме».

Цікава, хто з нас увогуле «ў тэме»?

Па дапамогу сёння звярнуўся Сяргей. Мужчына мае архітэктурную студыю і нядаўна набыў у офіс вялікае люстэрка, што называецца, «з гісторыяй». Па словах гаспадара, раней яно належала адпаму з польскіх шляхецкіх родаў. Люстэрка сапраўды ўражвае як памерамі (амаль пад самую столь), так і якасцю выканання — ручная разьба на раме, дзіўныя ўзоры...

— Яно вельмі добра падыходзіць да нашага інтэр'ера, але я адчуваю, што ад яго, так бы мовіць, «фаніць», — загадкава кажа Сяргей — Гэта цяжка патлумачыць словамі, думаю, вы самі ўсё адчуеце. У нас у офісе жыве кот, дык ён гадзінамі сядзіць каля люстэрка, быццам нешта бачыць у ім.

Сяргей не ўтойвае, што ўжо доўгі час з Дзмітрыем знаёмы асабіста, і звязала іх менавіта эзатэрыка. Адчуванне магчымага падману ў мяне не ўзнікае — надта шчыра мужчына распавядае пра сваю праблему. «Журналістаў не шкада», — адпускае Дзмітрый жарт з разраду «чорнага гумару», прапускаючы мяне наперад.

Падыходжу да люстэрка, доўга ўглядаюся ва ўласнае адлюстраванне, потым — па парадзе Дзмітрыя — спрабую расканцэнтраваць погляд. Абсалютная цішыня і ніякіх адчуванняў, акрамя звычайнай незадаволенасці ўласным выглядам і лёгкага голаду — ужо як-ніяк вечар. Відаць, нават тагасветны артэфакт, калі ён ёсць, не ў сілах прабіць лёгкі цынізм бывалага журналіста!..

### Памерацца статусам

«Паляўнічыя» некалькі хвілін прыглядаюцца да прадмета трывогі гаспадара, абыходзяць яго з розных бакоў, робяць малазразумелыя шаманскія жэсты (мой унутраны голас адразу ж гэта агучыў), а пасля збіраюцца на невялічкі «кансіліум». Да нас даносяцца абрыўкі сказаных шэптам фраз «там іншая прастора, якую трэба запоўніць», «яно хоча, каб яго запоўнілі», «я не адчуваю, што ў гэтага люстэрка ёсць гаспадар, у тым і праблема»...

Заключэнне экспертаў — усё не так страшна. Прадмет, па словах каманды, проста мае энергетыку пэўнага месца і людзей, якія раней ім валодалі. Гэта і стварае дыскамфорт для новага ўласніка. Пры дапамозе няхітрых дзеянняў можна зрабіць, так бы мовіць, «скідванне да заводскіх установак». Хаця, як па мне, напачатку не перашкодзіла б проста яго памыць. Да аперацыі прыступае «Ракетніца»-Цімафей: выконвае чаргову шэраг таямнічых працэдур, сярод якіх заплюшчванне вачэй і правядзенне рукамі па раме.

— Дзеля таго, каб узаемадзейнічаць з сур'ёзнымі прывідамі, трэба самому мець максімальна пашыраную свядомасць, — з сур'ёзным выглядам тлумачыць Дзмітрый. — Справа ў тым, што мы звычайна не змагаемся з тагасветнымі істотамі, а спрабуем з імі «дамовіцца». А дзеля таго, каб з табой увогуле кантактавалі, трэба валодаць пэўным статусам, хаця б роўным з ёй, а лепш — больш высокім. Галоўны наш спецыяліст у гэтым — Цімафей, ён лепш ведае працэс гэтага дыялогу. («Вось чаму я нічога не адчуў перад люстэркам, — мільгае думка. — Я ж не дарос...»)

Правяраць вынікі працы ідзе Сяргей. Мужчына імгненна канстатуе — цяпер усё нармальна. З гэтым, смачна пазяхнуўшы, пагаджаецца і кот. Праўда, і раней не было адчування, што вусаты насельнік асабліва зацікаўлены тагасветным артэфактам.

### Праца з гарантыяй

Акрылены поспехам Дзмітрый адразу ж прапануе кліенту дадатковую паслугу. Па яго словах, памяшканне не спрыяе прыліву працоўных сіл, але пры дапамозе пэўных аперацый гэта можна выправіць. І тут я пагаджаюся — сапраўды, офіс надта нагадвае кватэру, у тым ліку і мэбляй. Але чаму б напачатку проста не зачыніць дзверы на кухню?

Пад атмасферную музыку з бесправаднай калонкі Дзмітрый заплюшчвае вочы і быццам бы ўваходзіць у транс. Ён пачынае рухацца па пакоі, спыняючыся то тут, то там на некалькі хвілін. Побач увесь час знаходзіцца Марыя з выцягнутымі рукамі. Працэдура доўжыцца хвілін 15, мы з гаспадаром і Цімафеем тым часам п'ём гарбату, назіраючы за шчыраваннем Дзмітрыя.

Калі працэс «структуравання прасторы» завяршаецца, «паляўнічы» вяртаецца да нас знясіленым. «Цяпер — дадому, адсыпацца», — канстатуе ён. Адзінае, на што Дзмітрыю хапае сілы — разлічыць кліента за паслугу. Дарэчы, кліентаў заўсёды чакае бонус — бестэрміновая гарантыя на зробленае.

Напрыканцы Цімафей, заўважыўшы мой скепсіс, прапануе некалькі эксперыментаў. Спачатку спрабуе «дакрануцца» да маёй рукі праз іншы прадмет, потым дэманструе навыкі «бескантактнага бою». Але нічога не спрацоўвае. Напрыканцы нават пачынаю трохі саромецца сваёй неадчувальнасці...

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

SEX=БАЛЯСЫ

# І ЗБОКУ БАНЦІК

**...Ехаў неяк у вёску ў маршрутцы і міжволі слухаў размову купкі маладых дзяўчат, што ў апошні момант заскочылі ў аўтобус. Хаця чаму міжволі? Як дагэтуль яны дэманстратыўна пакурылі на вачах ва ўсіх пасажыраў, гучна смеючыся і прысёрбваючы з рыльцаў бутэлек «пепсі», так і цяпер гутарка, мяркуючы па тэме і ўжытых абаротах, была скіравана хутчэй для вушэй навакольных. Дзяўчаты — на выгляд навучэнкі каледжа — відавочна «кідалі панты». Сведчаннем таму была і іх знешнасць, у якой прысутнічала ўсё, што сёння папулярнае ў моладзі. Гэтае «ўсё і разам» надавала вобразам дзяўчат нейкую карыкатурнасць. Менавіта ў такіх сітуацыях кажуць, што не хапае толькі банціка збоку. Вясковыя ехалі дадому. («У некаторых маладых людзей на майках напісана, што яны любяць Н'ю-Ёрк, а на твары — што сваю вёску».) Не падумайце, што я маю нешта супраць вёскі, я сам адтуль родам. Справа ж зусім у іншым. («Кажуць, што дзяўчыну можна выцягнуць з калгаса, а вось калгас з дзяўчыны — часам проста немагчыма».)**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Вось толькі не кажыце, што тут нехта натацыі чытае! «Вой, тата, ты ж сам некалі быў такім!» — жартавалі некалі чэмпіёны Вышэйшай лігі КВЗ, каманда БДУ. Так, і мы ў свой час былі дзёрзкімі. Таму што да дрэнных хлопчыкаў, як усім вядома, дзяўчатак цягне больш. («Адна дзяўчына закахалася ў добрага хлопца замест дрэннага і зламала прасторава-часовы кантынуум».) Проста жаданне здавацца дарослымі пры фактычнай адсутнасці жыццёвага досведу (а таксама густу і элементарнай культуры паводзін) часам утвараюць грымучую сумесь. Дзяўчаты наперабой гучна распавядалі пра сваё гламурнае жыццё ў сталіцы. Адна сыпала назвамі модных забаўляльных устаноў, дзе ёй даводзілася бываць. Другая згадвала, як танцавала стрыптыз і да таго датанцавалася, што... забылася там сукенку («Дарагі, а куды падзелася мая сукенка?» — «Ты ў ёй нікуды не пойдзеш!» — «А ну расцісні кулак!..») Трэцяя — як яе не пускаў з сяброўкамі ў клуб ахоўнік з-за дрэс-кода, і яна паклала яму ў кішэню грошай і прайшла. («У кожнай дзяўчыны павінна быць маленькая чорная сукенка. У мяне таксама ёсць чорная сукенка, якая мне малая»). Прычым у кожным сказе адбываўся перыядычны пераход на «Шнурава харэй», што саміх дзяўчат аніколькі не засмучала («Ідэальная сварка: «Ды пайшла ты!» — «Сам пайшоў!» — «Пайшлі разам?» — «Давай...»). Я не стаў бы прыводзіць гэты выпадак, каб «размова» вялася выключна вакол строяў і забаў.

**«Люблю сваю жонку. Прыемна глядзець на жанчыну, якая разбіраецца ў мужчынах». А пры такім раскладзе ёй і банцік збоку будзе пасаваць.**

Самае цікавае пачалося, калі гаворка дзяўчат перакінулася на процілеглы пол. І ўсё той жа «Шнурава харэй» пачаў спалучацца ўжо з гарачымі эпітэтамі: маўляў, вы бачылі, я-к-і-я там былі хлопцы (гэта ў перакладзе на літаратурную мову)?!! Насамрэч гучала, як у анекдоце: «Прабачце, малады чалавек, а вы не пакажаце мне дарогу да сваёй спальні?» Вядома, кожны ведае, як трэба правільна намякаць мужчынам на адносіны. «Чаго ты адзін? Баба табе патрэбна. Каб клапацілася, кахала. Добрая баба табе трэба. Я». Уявіў сабе, як у дзяўчат складвалася размова з тымі хлопцамі, завязваліся адносіны і чым у выніку магло ўсё скончыцца. Калі магло... («Я малілася Богу, каб ён даў мне добрага мужа. І Бог даў мне добрага мужа. А вось муж мой не маліўся. І таму ён атрымаў тое, што атрымаў»).

...Неяк у сецыве разгарэлася абмеркаванне быццам бы ўрыўка з кнігі па дамаводстве, выдадзенай у 1960-х гадах у СССР. «...Вы павінны памятаць, што да прыходу мужа са службы трэба рыхтавацца штодзённа... Для гэтага выпадку самі надзеньце чысты фартух і пастарайцеся сябе ўпрыгожыць, напрыклад, завяжыце ў валасы бант. У размовы з мужам не ўступайце, памятайце, як моцна ён стаміўся і на што яму даводзіцца ісці штодня на службе дзеля вас — моўчкі накарміце яго, і толькі пасля таго, як ён прачытае газету, вы можаце паспрабаваць з ім загаварыць». Сярод дзяўчат гэты ўрывак выклікаў нямала эмоцый. Напрыканцы абмеркавання назіраўся іх сапраўдны выбух: «Пайду куплю газету... І бант», «Супер, і мне бант патрэбен. Газету, так і быць, з работы прынясу»... У выніку высветлілася, што гэты ўрывак з кнігі аказаўся фейкам. Яшчэ не ведаючы гэтага, дзяўчаты з гонарам (і гумарам) выйшлі з сітуацыі.

Гэта я да чаго расказваю? Нядаўна фінскія вучоныя правялі апытанне сярод больш як 10 тысяч мужчын, каб вызначыць параметры ідэальнай жанчыны. Апроч іншага, удзельнікі назвалі прывабнымі жанчын інтэлектуальнай працы, якія з'яўляюцца добрымі суразмоўцамі і даглядаюць сябе. Раней вынікі даследаванняў аўстралійскіх і амерыканскіх вучоных таксама паказалі, што мужчына нашага часу ў першую чаргу звяртае ўвагу на разумовыя здольнасці сваіх выбранніц, а ўжо пасля — на прыгажосць. Што тут дадасі? «Люблю сваю жонку. Прыемна глядзець на жанчыну, якая разбіраецца ў мужчынах». А пры такім раскладзе ёй і банцік збоку будзе пасаваць.

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Любы варыянт адчування песні правільны»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

***— Не магу не запытацца пра вашы беларускія карані.***

— Так, мой прадзед Яўсей з Мінска. Ён у сталінскія часы быў сасланы ва Удмурцію. А мама нарадзілася ў Рэспубліцы Марый Эл, у сталіцы Йошкар-Ала. Не так даўно дзядзька алічбаваў дзённікі прадзеда, і я змог больш даведацца пра яго жыццё. Аказваецца, ён некалі нават выдаваў сваю газету на беларускай мове.

***— А сёння ці адчуваеце вы асаблівую сувязь з беларускай зямлёй?***

— Так, кожны раз, калі вяртаемся з гастроляў праз Беларусь, то ўжо тут адчуваем сябе, як дома. На жаль, сваякоў у мяне ў Беларусі не засталося, але гэтыя мясціны ўсё роўна ўспрымаюцца як родныя. Хоць не ведаю беларускай мовы, я адчуваю народ, ён мне вельмі блізкі. Зямля, ментальнасць, людзі, якія да нас падыходзяць пасля канцэрта, мне здаюцца роднымі. Гэта самае галоўнае.

***— Мяркуючы па першым уражанні, нельга сцвярджаць, што на вашых канцэртах публіка сапраўды «адрываецца». Гэта глыбей: нейкія ўнутраныя перажыванні, якія ператвараюцца ў медытацыю. А вы самі якой рэакцыі чакаеце ад слухачоў?***



**«Тэкст песні, пазбаўлены алюзій, метафар і парафраз можа быць хіба што інструкцыяй па зборцы пыласоса, але ніяк не паэзіяй».**

— Мы нічога не чакаем. Гэта як кветка — садзіш зярнятка ў глебу і чакаеш, што вырасце. Можа быць па-рознаму: вырасце вялікая зялёная расліна ці, наадварот, маленькая і сціплая. Без усялякага какецтва скажу, што кожны раз падчас сустрэчы з публікай адбываецца нешта магічнае, кожны раз нібыта наноў адчуваеш рэчаіснасць, аддачу.

***— Ваш гурт адметны менавіта спевамі на розных мовах, часам нават старажытных...***

— Большая частка нашых тэкстаў па-руску, але сапраўды, мы выконваем песні і на іншых мовах. Напрыклад, на мове старажытных індзейцаў — «Tapachula», песня «Benga» — на мове племені Бенга. Ёсць песня «Sadanah» на арабскай мове, мы спяваем на фарсі, англійскай, нямецкай, сербскай мовах.

***— Самі разумееце, пра што спяваеце?***

— Адкажу пытаннем на пытанне: ты адчуваеш, пра што мы спяваем?

***— Так. Але, як піша Чак Паланік, незразумеламу можна надаць любы сэнс. Які ж сэнс для вас першасны?***

— Першаснае тое, што ты сама адчуваеш. У гэтым і ёсць магія. Любы інструмент у любым творы — частка музычнай канцэпцыі. Чаму ў нас прынята голас аддзяляць ад усёй астатняй музыкі? Голас — гэта такі ж інструмент, як трамбон, віяланчэль... Ты ж не будзеш пытаца, што ў класічным творы хацелі сказаць партыяй трамбона? Таму што твор працуе толькі як цэлае. Ты слухаеш творы кампазітараў і захапляешся імі. Мне, напрыклад, вельмі блізкі Вагнер: ён звяртаўся да фальклору, міфалогіі... Прытым, што няма нейкай канкрэтыкі, слухаючы, разумееш, пра што твор.

***— А як жа сэнс тэксту песні?***

— У некаторых выпадках тэкст, яго ідэя — сапраўды адно з вымярэнняў песні, а ў некаторых голас выступае ў ролі музычнага інструмента. Любы варыянт адчування песні правільны. У гэтым і ёсць магія. Мастацтва павінна быць шматгранным і пакідаць прастору для фантазій. Гэтым яно адрозніваецца ад навукі. Тэкст песні, пазбаўлены алюзій, метафар і парафраз можа быць хіба што інструкцыяй па зборцы пыласоса, але ніяк не паэзіяй.

***— Але ж аўтарскі пасыл кожнай кампазіцыі таксама важны?***

— Аўтарскі пасыл — па-за словамі. І, зразумела, у нашых тэкстах я для сябе бачу глыбокі сэнс, але ніколі не буду тлумачыць яго іншаму, каб не ламаць чужое ўспрыманне.

***— У вас вельмі многа досыць экзатычных інструментаў з розных краін свету. Іх дораць ці самі з розных паездак прывозіце?***

— Гэта кавалачак культуры краіны, які можна прывезці з сабой як цудоўны ўспамін і як рэальны досвед. Падчас кожнага падарожжа я стараюся сустракацца з мясцовымі музыкантамі, пераймаць іх вопыт, вучыцца. Гэта робіць вандроўкі больш падобнымі на экспедыцыі. Інструменты ў нашай калекцыі — з паездак у Ліван, Іран, Сірыю, Іарданію, Эфіопію і Марока, а яшчэ ў Кітай, Камбоджу і В'етнам.

***— Ці сочыце вы за творчасцю сучасных беларускіх гуртоў? Магчыма, з кімсьці з іх маглі б разам выступіць у межах аднаго вялікага канцэрта?***

— Шчыра кажучы, сучасных беларускіх гуртоў ведаю нямнога. Выключу хіба толькі «Сярэбранае вяселле» і «Пятлю прыхільнасці». Але я не вельмі ўяўляю сумесны канцэрт. Усё ж такі мы вельмі розныя.

***— Ці ёсць планы зрабіць песню на беларускай мове на аснове фальклорнага матэрыялу?***

— Мне здаецца, што менавіта на ўзроўні фальклору, яго мелодыкі няма радыкальных адрозненняў беларускай народнай песні ад рускай. На беларускай мове, магчыма, калі-небудзь заспяваем. Сёння нам, бадай, максімальна цікавая родная руская мова, мы з ёй мала працавалі. Прыйшоў час запаўняць прабел.



**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.023.
Нумар падпісаны ў 19.30 04.05.2016 г.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

***«Героі маіх твораў жывуць і ходзяць побач са мной. Усё, што з імі адбываецца, я пераношу на старонкі сваіх твораў», — прызнаецца пісьменнік Васіль Ткачоў, і апавядальная манера пісьма аўтара як бы сама падштурхоўвае чытача да такой высновы. Быццам пераказвае чарговую гісторыю з вясковага побыту яе рэальны сведка.***

***На самай справе, усё, зразумела, не так проста і не так лёгка — перастварыць на паперы няхай сабе (а можа і — тым больш) жыццёвы выпадак, каб гэта было цікава іншым, каб чытач не толькі паверыў аўтару, але хоць бы на міг паверыў сваім адчуванням, што ўсе гэтыя героі ўзятыя з твайго мінулага — так добра яны табе ўяўляюцца...***

**Алесь БАДАК.**

## Васіль ТКАЧОЎ

# ПІСЬМАНОСЕЦ

У ТОЙ вечар патэлефанавала Сцяпанаўна, настаўніца-пенсіянерка: памёр Мішка-паштальён. «Больш недарэчную смерць і прыдумаць цяжка, — прамовіла яна. — Нявесткі прыйшлі да яго з Чырвонага Аратага, выпілі, вядомая справа, а тады нешта падсмажыць рашылі на пліце яны ці што. Адным словам, на кухні шмат гаспадынь не павінны быць, праўду кажуць разумныя людзі. У яго ж, у Мішкі, стаяў побач і запасны балон. Хтосьці з іх і адкрыў у ім вентыль, а балон жа не быў падключаны... Пакуль сёе ды тое, пакуль разабраліся, і самі не заўважылі, што ўсе сенцы запоўніліся газам, а Мішка — ведама ж, выпіўшы быў — і чыркнуў запалкай. Дзеўкі неяк выратаваліся, а ён, кажуць, пабег яшчэ ў хату, нібыта ў яго там грошы ляжалі, нават даляры, дык каб забраць. Там і застаўся: атруціўся рэчывамі гарэння, захліпнуўся, адным словам... Пажарнікі з райцэнтра прыехалі, паспелі хату збольшага выратаваць... Хату, а не яго... Каму цяпер гэтая хата патрэбна?.. Без гаспадара?.. Заўтра будзем хаваць Мішку...»

Эх, Мішка, Мішка! З ім у мяне склаліся асаблівыя адносіны. Колькі помню, ён быў паштальёнам, самым, бадай што, жаданым для мяне чалавекам. Уся справа ў тым, што я, ледзьве навучыўшыся пісаць, дасылаў у раённую газету, а потым, асвойтаўшыся, у абласную і рэспубліканскія кароценькія допісы пра сваіх землякоў. Тады быў цікавы час. У вёсках пачалі з'яўляцца першыя тэлевізары, напрыклад. Чым не навіна? Нехта з вяскоўцаў выйграў па латарэі пральную машыну ці набыў легкавік — у друк, факт цікавы! Або мы, школьнікі, у час летніх вакацый дапамагалі роднаму калгасу акучваць бульбу, працавалі на лузе і на зернятоку — і гэтак далей, толькі пішы.

Ну, а першым чытачом маіх заметак быў, канешне ж, Мішка Маланнін. Ён ездзіў на веласіпедзе па пошту ў суседнюю вёску, дзе мясцілася паштовае аддзяленне, і таму я заўсёды сустракаў яго ці не першым: ну як там, сусед, ёсць што? Калі публікацыя мелася, твар у яго лагаднеў, падобраму неяк свяціўся, і тады паштальён спыняўся, даставаў газету і чытаў услых тое, што я напісаў колькі дзён назад на звычайным аркушы з вучнёўскага сшытка. Іншы раз Мішка даваў і свой каментарый: «Прыўкрасіў! Ці сам так прыдумаў? Але — добра. Твары». Калі публікацыі не было, ён праязджаў міма, але не забываўся паказаць мне знак галавою: сёння нічога няма, братка.

ВОСЬ Мішкі не стала. Шкада. Вельмі. Стары халасцяк, высокі, хударлявы, з прыгожай русявай чупрынай, ён іншы раз, пакінуўшы дома парожнюю паштарскую сумку, прыходзіў да нас, траха маладзейшых за яго хлопцаў, на школьны двор, дзе мы гулялі ў валейбол або проста кідалі на баскетбольнай пляцоўцы на дакладнасць мяч у кальцо.

Мішкава прозвішча было сугучнае назве нашай вуліцы — Ганчароўка, толькі без «ка». Ды яно і зразумела: вуліца таму здавён так і называецца, што там жылі ў асноўным Ганчаровы. Ганчаровы — Ганчароўка. Але ўсе звалі-велічалі Мішку Маланніным. «Маланнін сказаў», «Маланніна не бачылі?» Маланняй звалі яго маці, высокую, хударлявую, заўсёды маўклівую і ціхмяную жанчыну. Як жыла сапраўды ціха, так і пайшла на той свет непрыкметна: вёска, мусіць, і не заўважыла, што не стала Маланні, маці шасці сыноў і ўдава мужа Івана, які не прыйшоў з вайны, і таму для сваіх дзяцей жанчына была ў адной асобе — і бацькам, і маткай. Была — Маланняй, адзінай апорай і надзеяй для іх. А што ж сыны? Выраслі хлопцы і разляцеліся па белым свеце — хто дзе апынуўся. Тады быў СССР, і едзь куды пажадаеш, куды вочы глядзяць. Хоць на Сахалін альбо Камчатку. Далёка можна было трапіць. Так яно і атрымалася. Дома застаўся толькі Мішка, хоць і не быў ён малодшым у сям'і. Аднак тут сваю ролю адыграла армія. Так-так, менавіта яна. Забяруць хлопца ў салдаты — ён і не вяртаецца ў вёску, тады ж пашпарт няпроста было атрымаць. А Мішку чамусьці ў армію не прызвалі. А мо проста жыццё так распарадзілася, каб Мішка быў пры маці, каб ён стаў пісьманосцам і прыносіў старой менавіта такія пісьмы ад сыноў, якія сам не толькі чытаў ёй, але і сам... пісаў.

СПЯРША пісьмы ад сыноў прыходзілі акуратна. Старэйшы, Віктар, асеў на Сахаліне. У арміі атрымаў спецыяльнасць шафёра, таму з працай праблем не мелася. А потым ад яго перасталі паступаць весткі. Малання ўстрывожылася: штож там з Віцькам, чаму маўчыць? Мо здарылася што, га, Мішка, ты не ведаеш? Мішка ведаў: няма больш Віктара, разбіўся на грузавіку, толькі я — даруй, мама — не сказаў табе пра тое. Дрэнна зрабіў ці не — ён і сам не ведаў, а толькі неўзабаве суцешыў маці: ёсць, ёсць пісьмо ад Віктара, мама! Паслухай, што ён піша. І Мішка зачытваў пісьмо, якое сам і напісаў. «...жыву добра. Работа падабаецца, хоць зімой асабліва цяжка: заносіць Сахалін снегам — ні праехаць, ні прайсці. Жыву ў тым жа інтэрнаце, жаніцца пакуль не збіраюся. Пытаеце, калі прыеду ў водпуск? Прыеду. Абавязкова. Не адпускае пакуль начальства, бо работы шмат, а вадзіцеляў у нашай аўтабазе не хапае. Я і сам вельмі сумую па вас, мама і Міша, не папракайце мяне асабліва».

Ніхто, вядома ж, не ведаў, што, прачытаўшы маці такое пісьмо, Мішка выбягаў на двор і румзаў там, як дзіця. Аднаго разу ён прынёс ад Віктара пасылку. Купіў у райцэнтры квястую гарусавую хустку, некалькі бляшанак рыбных кансерваў, кілаграм дарагіх цукерак і прыклаў да ўсяго гэтага кароценькае пісьмо: як атрымаеце, дарагія мае, гэтую пасылку, напішыце мне, як дайшла...

Малання, пакаштаваўшы тады рыбных кансерваў, пахваліла:

— А на тым Сахаліне рыба смачнейшая, чым у нас. Можа і правільна Віцька зрабіў, што там застаўся? Толькі прыехаў бы... Дужа пабачыць яго хочу...

ПАЗНЕЙ сумная вестка прыйшла з Данбаса: атруціліся бытавым газам Ягор і Мікола. Мішка зноў нічога не сказаў маці. Тая пэўны час і не пыталася пра сваіх сыноў-шахцёраў: былі ж нядаўна ў водпуску, пабачыліся, слава табе Госпадзі, у іх усё добра, сытыя і апранутыя, бо зарабляюць жа неблагую капейчыну. А пазней Малання пачала цікавіцца, як толькі Мішка з'яўляўся ў хаце з паштовага аддзялення:

— Ягорка з Міколкам не пішуць? Не пішуць... Нешта ж яны?.. Сны ж кепскія бачу... Нядобрыя сны...

А праз колькі дзён спраўдзілася жаданне маці — прыйшло, прыйшло з Данбаса пісьмо! Мішка сядзеў за сталом перад Маланняй і чытаў, інш раз яго душылі даўкія камякі ў горле, але ён стараўся не выдаваць сябе, не паказваць, што хвалюецца і... хлусіць. Ды каму хлусіць — самаму роднаму, самаму блізкаму чалавеку. Недзе глыбока ў душы ён дакараў сябе: «Ці ж можна так? Вялікі ж грэх бярэш ты на сябе, хлопча! Падумай, што ты робіш? Даруй, Божа!..» І працягваў чытаць: «Шахта наша лічыцца перадавой, на ёй некалі здабываў вугаль сам Аляксей Стаханаў, на яе не кожнаму пашчасціць трапіць. Нам пашэнціла. Зарабляем яшчэ больш, чым раней. Высылаем табе, мама, трохі грошай, хоць ты і будзеш папракаць нас: навошта, нам з Мішкам хапае. Але прымі грошы ад чыстага сыноўняга сэрца. Гэта наш доўг і абавязак дапамагаць людзям, якія далі нам жыццё». На гэтым Мішка спыняўся, даставаў з кішэні свае дзве асігнацыі па дваццаць пяць рублёў, клаў на стол і акуратненька падсоўваў бліжэй да Маланні: табе, мама.

— Не трацілся б, — уздыхала Малання.

— Нічога, не пабяднеюць, — супакойваў Мішка.

НАЗАЎТРА прыехаў з Кубы Пятро, кім ён там рабіў — не казаў, адно хіба разводзіў рукамі і дужа цікаўным паведамляў, што даваў падпіску і прыкладваў палец да вуснаў: ша! І ўсе ўсё разумелі: абы-каго на Кубу не пашлюць і абы-што такому чалавеку і спецыялісту, як Пятро Ганчароў, не давераць. Аб'ект, на якім быў зямляк, пэўна ж, надта сакрэтны і важны. Хоць мала хто ведаў, якая наогул спецыяльнасць у яго. Аднак факт застаецца фактам: Пятро прывёз з Кубы поўны чамадан розных трантаў, асабліва тэнісак, рознакаляровых, стракатых, таму Мішка ледзь не ўвесь месяц кожны дзень хадзіў у новай тэнісцы.

Многія тэніскі Мішка потым даносіць да шчэнту: яны выгараць у яго на спіне настолькі, што амаль усе стануць аднолькавыя — бляклыя, невыразныя.

Пасля Кубы Пятро спыніўся ў райцэнтры, абзавёўся сям'ёй, быў шчаслівы ў шлюбе і часта прыязджаў да маці і брата. А тады няма і няма яго. Малання захвалявалася: «Што з Пецькам? Чаму не паказваецца? Тут жа блізка...» Мішка папрасіў Пятрову жонку, каб тая прыехала і сказала старой, што Пецьку яе зноў тэрмінова адправілі ў камандзіроўку — ну хоць бы і на Кубу. Нявестка ўпарцілася, аднекавалася: я не змагу, у мяне не атрымаецца салгаць з вока на вока свякрусе. «Раскусіць». Але Мішка нейкім чынам яе ўгаварыў. Малання паверыла. Пятра ж забілі сярод белага дня. І трэба ж было яму зрабіць заўвагу ў краме хлопцам, якія нахабна лезлі без чаргі. Падсцераглі, калі выйшаў на ганак Пятро, і наляцелі зграяй. Забілі да смерці чалавека. Ну, быў суд, далі ім там па некалькі гадоў кожнаму. Яны даўно вярнуліся з месцаў зняволення, а чалавека няма. Ці паразумнелі яны хоць, забойцы? Ці сталі людзьмі? А Пятро — браць па гадах калі — і сёння б мог жыць.

А маці, Малання ж, так і не дачакалася сына з... камандзіроўкі.

КАЛІ здарылася бяда з самым малодшым, Мішка паехаў на пахаванне ў Краснаярск. Сцёпка служыў там і застаўся, рабіў на ваенным заводзе. Аварыя ў цэху сярод іншых людзей пазбавіла жыцця і яго. Што Мішка сказаў маці, калі адпраўляўся на пахаванне, сказаць не бяруся, ведаю толькі адно: яна пайшла на той свет з надзеяй і верай, што ў яе сыноў усё добра...

Я ўвесь час хацеў спытаць у Мішкі: а ці правільна ты зрабіў, суседзе мой даражэнькі, што ўзяў на сябе такі грэх? Што пазбавіў маці слёз, якія па прыродзе сваёй прызначаліся ёй? Пазбавіў слёз і гора... Ці мацярынская душа без болю ўсё ж — і не душа зусім?.. Што сам скажаш на гэта? І ці можна тое, што зрабіў ты, лічыць грахом? Мо гэта, наадварот, своеасаблівы сыноўні подзвіг — зрабіць так, каб матулі не балела?

Не спытаю. Спазніўся...

*1 студзеня 2016*

■ Май на ўвазе

# ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА МАЙ



**5 мая, чацвер.** Спрыяльны дзень для стварэння прычосак, якія будуць захоўваць форму доўгі час.

**6 мая, пятніца.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі і любых маніпуляцый з валасамі. Лепш нават не мыць і менш расчэсваць.

**7 мая, субота.** Сёння лепш даць валасам спакой, любое ўздзеянне іх траўмуе.

**8 мая, нядзеля.** Неспрыяльны час для наведвання цырульні.

**9 мая, панядзелак.** Стрыжка можа сапсаваць настрой і прынесці дыскамфорт, укладку лепш рабіць звычайную.

**10 мая, аўторак.** Стрыжка ў гэты дзень прыцягвае багацце. Добра спрабаваць новыя стрыжкі, афарбоўваць валасы і рабіць хімічную завіўку. Фарба будзе стойкай. Стрыжыцеся, стварайце чароўныя мадэльныя прычоскі.

**11 мая, серада.** Стрыжка можа прынесці хваробы горла і верхніх дыхальных шляхоў, па магчымасці адмоўцеся ад паходу ў салон. Звычайны догляд будзе спрыяльна ўспрыняты валасамі, асабліва пажыўныя маскі.

**12 мая, чацвер.** Дзень, калі нервовая сістэма лёгка ўзбуджаецца. Стрыжка можа прывесці да канфліктаў на працы і дома да наступнай стрыжкі.

**13 мая, пятніца.** У гэты дзень спрыяльна падстрыгацца, рабіць мяккае меліраванне, хімічную завіўку. Валасы могуць быць сухаватымі, таму добра падтрымліваць вільготнасць маскамі.

**14 мая, субота.** Сёння крытычны дзень, у які неспрыяльныя не толькі стрыжка, але і любыя маніпуляцыі з валасамі.

**15 мая, нядзеля.** Катэгарычна непажадана што-небудзь рабіць з валасамі. Яны будуць непаслухмянымі, да таго ж стрыжка можа прыцягнуць хваробы.

**16 мая, панядзелак.** Выдатны дзень для стрыжкі і догляду валасоў. Афарбоўвацца лепш у светлыя колеры. Добра атрымаецца хімічная завіўка. Фарба і завіўка будуць стойкімі.

**17 мая, аўторак.** Дзень неспрыяльны для кардынальнай стрыжкі, але догляд валасоў прынясе спрыяльны эфект. Можна рабіць пажыўныя маскі, валасы потым будуць добра ляжаць.

**18 мая, серада.** Спрыяльны дзень для прывядзення валасоў у парадак. Час падыходзіць для стварэння прыгожых мадэльных стрыжак, афарбоўкі.

**19 мая, чацвер.** Выдатны дзень для наведвання цырульні. Валасы пасля стрыжкі лягуць прыгожа, форма будзе радаваць вока.

**20 мая, пятніца.** Стрыжка непажаданая. Валасы можна пашкодзіць так, што яны доўга будуць хварэць. Сёння лепш наогул нічога з імі не рабіць.

**21 мая, субота.** Стрыжка ў гэты дзень прынясе дысгармонію, смутак і пагаршэнне здароўя.

**22 мая, нядзеля.** Укладка можа стварыць добры знешні выгляд, але стрыгчыся катэгарычна не рэкамендуецца з-за неспрыяльнага ўплыву на псіхіку і здароўе.

**23 мая, панядзелак.** Стрыжка ў гэты дзень нясе страты і небяспекі. Магчыма пагаршэнне здароўя валасоў і арганізма ў цэлым. Не рызыкуйце!

**24 мая, аўторак.** Сёння можна стрыгчыся, калі ёсць крайняя неабходнасць. Валасы могуць дрэнна легчы, але ў цэлым шкоды не будзе.

**25 мая, серада.** Адмоўцеся ад любых эксперыментаў са знешнасцю.

**26 мая, чацвер.** Не стрыжыцеся. Для ўкладкі валасоў дзень нейтральны.

**27 мая, пятніца.** Добры дзень для стрыжкі і афарбоўкі валасоў, калі вы разлічваеце на прыгожы знешні выгляд і поспех у справах. Прычоска захаваецца надоўга.

**28 мая, субота.** Стрыжка ў гэты дзень прыцягне дабрабыт і задаволенасць. А вось фарба хутка змыецца, а хімічная завіўка не будзе стойкай.

**29 мая, нядзеля.** Сёння добра стрыгчыся, фарбаваць валасы і рабіць хімічную завіўку, але неабходна ўлічыць, што валасы менш успрымальныя да ўздзеяння, чым звычайна. Добра фарбаваць валасы ў цёмныя колеры.

**30 мая, панядзелак.** Стрыжка ў гэты дзень прынясе паслабленне здароўя, прыцягне хваробы. Валасы будуць непаслухмянымі і нежывымі, можа з'явіцца сівізна.

**31 мая, аўторак.** Дзень не падыходзіць для стрыжкі, магчымыя праблемы са зрокам. Валасы дрэнна ўспрымаюць догляд і лячэнне, лепш пакіньце іх у спакоі.

■ Будзь у курсе!

## РЭГУЛЯРНЫЯ ПА МІЖНАРОДНЫХ

**Прадпрыемства «Мінсктранс» з 1 чэрвеня будзе выконваць рэгулярныя рэйсы па шэрагу міжнародных маршрутаў.**

У прыватнасці, на маршруце Мінск — Кіеў аўтобусы будуць адыходзіць: з Мінска ад АВ «Цэнтральны» ў 22.20, ад АВ «Усходні» ў 22.45 — па серадах, чацвяргах, пятніцах і нядзелях; з Кіева ў 21.30 — па чацвяргах, пятніцах, нядзелях (замест субот) і панядзелках.

На маршруце Мінск — Рыга праз Браслаў, Даўгаўпілс адпраўленнем: з Мінска ў 09.50 штодня, у 21.30 па серадах, чацвяргах, пятніцах і нядзелях; з Рыгі адпаведна ў 08.00 штодня, у 21.20 па чацвяргах, пятніцах, нядзелях і панядзелках.

На маршруце Мінск — Масква адпраўленнем: з Мінска ў 20.45 — па чацвяргах, пятніцах, суботах і нядзелях; з Масквы ў 20.40 — па пятніцах, суботах, нядзелях і панядзелках.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»**

| | |
|---|---|
| **ЛОТ №1** | Капитальное строение с инв. №500/С-41303 по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 52/23. Площадь – 239,0 кв.м. Наименование – Здание складов. Назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000005000418, пл. 19.9465 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования (Доля продавца в праве постоянного пользования: 1773/2500), с установленными ограничениями: Санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 2.5940 га; Охранная зона магистральных трубопроводов, площадь 1.6738 га;<br>Доля в праве постоянного пользования на земельный участок, относящаяся к капитальному строению после регистрации перехода прав собственности, – 3/1250.<br>Объект недвижимости обременен договором аренды.<br>Условия дальнейшего использование объекта – в соответствии с регламентом генерального плана г. Минска |
| **Начальная цена (в т.ч. НДС 20%), бел. руб.** | **1 485 472 080** |
| **Задаток, 5%** | **74 273 604** |
| **ЛОТ №2** | Капитальное строение с инв. №500/С-41310 по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 52/20. Площадь – 196,0 кв.м. Наименование – Мойка. Назначение – Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000005000418, пл. 19.9465 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования (Доля продавца в праве постоянного пользования: 1773/2500) с установленными ограничениями: Санитарно-защитные полосы водоводов, площадь 2.5940 га; Охранная зона магистральных трубопроводов, площадь 1.6738 га;<br>Доля в праве постоянного пользования на земельный участок, относящаяся к капитальному строению после регистрации перехода прав собственности, – 235/100000.<br>Объект недвижимости обременен договором аренды.<br>Условия дальнейшего использование объекта – в соответствии с регламентом генерального плана г. Минска |
| **Начальная цена (в т.ч. НДС 20%), бел. руб.** | **1 473 072 480** |
| **Задаток, 5%** | **73 653 624** |
| **Шаг аукциона** | 5% |
| **Сведения об организаторе торгов, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»<br>220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25.<br>тел.: 8 017 286 78 59, факс: 8 017 286 76 80 |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»<br>220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25.<br>тел.: 8 017 286 78 59, факс: 8 017 286 76 80 |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата стоимости приобретенного на аукционе объекта осуществляется в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи.<br>Оплата задатка и лота производится резидентами в белорусских рублях на следующие банковские реквизиты: р/с 3012000790020 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226 г. Минск, пр-т Победителей, 29. Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240 ОКПО 37392696. Оплата задатка и лота производится нерезидентами в белорусских рублях или в доларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты на следующие банковские реквизиты: Сч./Асс.: 3012000790020(BYR); Сч./Асс.: 3012000790003 (USD) SWIFT CODE: BELBBY2X ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, пр-т Победителей, 29 БИК: 153001226 Банк корреспондент CITIBANK N.A., NEW YORK SWIFT CODE: CITIUS33 Асс.36249772; Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 10 (десяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до **16 мая 2016 г.** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 312 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **20 мая 2016 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, зал совещаний ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» |

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»

**Дополнительная информация по тел.: +375 17 284 94 32; +375 29 239 39 64, +375 44 580 63 02. E-mail: tushinskaya@horizont.bn.by**

## ООО «Управляющая компания «СОВЕТНИК» – управляющий по делу о банкротстве ООО «Альфалидер групп»,

### извещает о проведении торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего должнику

**Торги состоятся 6 июня 2016 года в 12.00 по адресу: г. Минск, Долгиновский тракт, д. 149а/1, к. 9.**

Для участия в торгах необходимо подать **до 03 июня 2016 года** заявку и перечислить на расчетный счет ООО «Альфалидер групп» р/с 3012031980016 в «Франсабанк» ОАО, г. Минск, код 266, УНП 191546592, сумму задатка в размере 5% от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5% от начальной цены предмета аукциона.

С имуществом, выставляемым на торги, можно ознакомиться по его месту нахождения, предварительно согласовав время с управляющим по тел. +375 29 342 18 42.

Прием заявок и документов на участие в торгах осуществляет организатор торгов – ООО «Управляющая компания «СОВЕТНИК» – ежедневно по рабочим дням с 9.00 до 18.00 по адресу: 220053, г. Минск, Долгиновский тракт, д. 149а/1, к. 9.

**Сведения об имуществе, выставляемом на торги.**

| Номер лота | Сведения об имуществе | Начальная цена, за ед. рублей без НДС | Сумма задатка |
|---|---|---|---|
| 1 | Конденсатор компенсирующий CBB-80-9uF-250V CSI, гибкий вывод (661 шт.) | 2 177 466 | 108 874 |
| 2 | Электромагнитный дроссель 220V/50Hz 11W (2400 шт.) | 25 802 734 | 1 290 137 |

Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По результатам аукциона организатор торгов составляет протокол в трех экземплярах.

Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней с даты проведения торгов.

Организатор вправе отказаться от проведения торгов не менее чем за 3 дня до даты проведения торгов.

С более подробной информацией о порядке, условиях проведения торгов, предметах торгов можно ознакомиться по тел. +37529 342 18 42.

## ПРИГЛАШЕНИЕ

**Унитарное предприятие Национального олимпийского комитета Республики Беларусь «Спортивно-оздоровительный комплекс «ОЛИМПИЙСКИЙ»**

## проводит аукцион №100 по продаже права заключения договора аренды изолированного нежилого помещения сроком на три года

| | Предмет аукциона (право заключения договора аренды), цель использования помещения | Площадь, м² | Начальная цена продажи |
|---|---|---|---|
| **г. Минск, пр-т Независимости, 80а** | | | |
| 1 | Изолированное нежилое помещение № 9 на 2 этаже (под офис) | 12,8 | 435 200 |
| **г. Минск, ул. Сурганова, 2** | | | |
| 2 | Изолированное нежилое помещение № 63 на 1 этаже (под офис) | 51,3 | 1 744 200 |

**Аукцион состоится «06» июня 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 2а, конференц-зал. Документы на участие принимаются по «03» июня 2016 года до 15.00 включительно по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок: **(017) 290-49-06, 290-47-18, 290-49-11.**

Интернет: **www.dvs.by.**

**Организатор аукциона (продавец) – УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ», г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота **расчетный счет 3012208250015, ОАО «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, МФО 153001964, УНП 101 508 270, УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ».** Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом на расчетный счет организатора аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан возместить УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

**ЗАСО «Промтрансинвест»**

**ПРЕДЛАГАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПРОЦЕДУРЕ ЗАКУПКИ № 2016-339180,**

**размещенной на сайте http://www.icetrade.by, по изготовлению бланков «Страховой сертификат. Обязательное страхование гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств–членов системы «Зеленая карта» (договор страхования «Зеленая карта»), тираж – 100 000 шт., тел. (17) 222 75 39.**

УНП 100357923

**Центр Промышленной Оценки**

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Полоцк-торг», Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Евфросиньи Полоцкой, д. 21** |

**Предмет аукциона**

**Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, пр-д Октябрьский, д. 9**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (номер дома) |
|---|---|---|---|---|
| **Административное здание** | здание многофункциональное | 1942 кв.м | 250/С-29605 | д. 9 |
| Составные части и принадлежности | 3 пристройки – кондитерский цех, материальный склад и ремонтная мастерская | | | |
| **Здание склада** | здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 948 кв.м | 250/С-29607 | д. 9/1 |
| Составные части и принадлежности | склад (продовольственный), склад (материальный), наружные сети электроснабжения | | | |
| **Здание столярной мастерской** | здание многофункциональное | 628 кв.м | 250/С-29606 | д. 9/2 |
| Составные части и принадлежности | подвал, 2 пристройки (склады), склад стройгруппы, пристройка (склад) | | | |
| **Водопроводная сеть** | сооружение специализированное коммунального хозяйства | 133,2 м | 250/С-41537 | д. 9 |
| **Канализационная сеть хозфекальная** | | 145,9 м | 250/С-41539 | |
| **Тепловая сеть** | | 89 м | 250/С-41538 | |
| Составные части и принадлежности | участок теплофикационного дренажа | | | |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Пл. 0,8383 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания производственной базы. Ограничения: водоохранная зона реки Полота, площадь 0,8383 га |
| **Обременения** | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона |

**Начальная цена с НДС 20% – 7 317 000 000 белорусских рублей**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **08.06.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **06.06.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

РЕАЛИЗУЕТСЯ ПРЕДПРИЯТИЕ **ООО «Шинстарк».** УНП 691469959. Цена договорная. Телефон **+375 293 941 941**

## Извещение о проведении 20 мая 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Автомагистраль»

| |
|---|
| **Предмет торгов №1** |
| здание административно-хозяйственное (наименование – здание административно-производственного корпуса с инвентарным номером 420/С-1070) общей площадью 1573,3 кв. м; здание специализированное транспорта (наименование – здание гаражей с бойлерной, кузницей, складом с инвентарным номером 420/С-1071) общей площадью 385,8 кв. м; здание специализированное транспорта (наименование – здание гаражей со складом материалов с инвентарным номером 420/С-1072) общей площадью 1017,4 кв. м; здание многофункциональное (наименование – здание гаражей со столярным цехом, лабораторией, складом с инвентарным номером 420/С-1599) общей площадью 1032,6 кв. м; здание административно-хозяйственное (наименование – здание проходной с инвентарным номером 420/С-1600) общей площадью 126,4 кв. м; здание специализированное коммунального хозяйства (наименование – здание туалета с инвентарным номером 420/С-35883) общей площадью 12,2 кв. м; сооружение неустановленного назначения (наименование – сооружение благоустройства с инвентарным номером 420/С-44516) общей площадью 11936,1 кв. м;<br>кран-балка (инв. № 041229); пресс гидравлический (инв. № 041202); станок вертикально-сверлильный ВСН-12 (инв. № 1031); станок настольный (инв. № 044341); станок токарный 1 м63 (инв. № 041677); два стеллажа изготовленных (инв. №№ 070869 и 070870); станок точильно-шлифовальный (инв. № 0124); автозаправочный блок-пункт АБП 00.00.000ПС (инв. № 020090); зеленые насаждения /ель, каштан, рябина, липа/ (инв. № 90022); комплектная трансформаторная подстанция 2 КТПТАС-В/К400/10/0,4-08У1 (инв. № 040088); станция контейнерная автозаправочная КА 33 (инв. № 020089); две топливораздаточные колонки (инв. №№ 020091 и 020092) |
| Площадь земельного участка – 1,9533 га, кадастровый номер 441300000009000041 |
